

## За што забілі беларускага хлопца?

Сталі вядомыя акалічнасьці гібелі 20-гадовага студэнта Аляксея Васілеўскага, які быў забіты ў ЗША. Але адказу на пытаньні, хто і чаму забіў яго, пакуль няма. **Расьследаваньне — старонка 12.**

**№ 27 (481)** 28 ліпеня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

аваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Па Брылі

Ён прыняў свой жыцьцёвы хрост як марпех, у 1939 годзе, пад Гдыняй. Янка Брыль быў апошнім з тых *пісьменьнікаў стагодзьдзя,* на вачах якіх сьвет руйнаваўся і паўставаў наноў: ягоны жыцьцёвы досьвед ахопліваў увесь беларускі XX век, з вайною і жыцьцём пад Польшчай уключна. Ён пайшоў у іншы сьвет як неаспрэчны аўтарытэт беларусаў. Ён быў маральным эталёнам, адным з тых Сакратаў, якія, паміраючы, застаюцца, пакідаюць па сабе дарогу: маральную дактрыну, узор паводзінаў і мысьленьня. Пайшоў адзін з нас — ён да апошняга свайго дня ахвяраваў грошы на выданьне “Нашай Нівы”. Калі вы атрымаеце гэты нумар, ён ужо ляжа на вечны спачын на могілках у Калодзішчах.

**Анатоль Сідарэвіч** апавядае пра апошнія дні Народнага пісьменьніка, свайго найбліжэйшага сябра — старонка 4. **Янка Брыль: “Гісторыя не паўтараецца”** — адказы на пытаньні “НН”, старонка 3.



**Фота Анатоля Клешчука**

## У ліпені на выданьне “НН” надышло столькі ахвяраваньняў, што няма як здрукаваць увесь сьпіс дабрадзеяў. Выдрук сьпісу ліпеньскіх фундатараў працягнем у жніўні. Шчыры дзякуй усім за шчодрасьць.

З.Л., Лявону Л., Веры Х., У.К., Марыі Н. зь Менскага раёну.
Н.Б. з Астравецкага раёну.
С.У. з Бабруйску.
Сяргею Ц., Аляксею Ч. з Баранавіч.
Іне С., Сяргею С., Галіне Г., О.Ж. з Барысава.
Вользе К. зь Берастаўіцкага раёну.
І.Ш., Ігару Б., К.М., Натальлі Х., Дзьмітрыю Ш., Мікалаю Б., Уладзімеру Л., Яўгену Б., Веры Ч. зь Берасьця.
Т.Ш., С.Р. зь Бярозы.
З.М., Л.Н. з Валожынскага раёну.
А.Б., Івану П. з Ваўкавыску.
Віктару Л., Ігару Б. з Воршы.
В. П., Ірыне Б., У.В., Веры К., Г.К., Аляксандру Л. зь Віцебску.
Пётру Ш. зь Віцебскага раёну.
Лідзіі С., Алене З., Валянціне З., М., Любові П. з Гомелю.
Аляксандру С., І.С., Вользе С., Георгію М., Андрэю Ш., Канстанціну Ж., Г. К., С.К., Мікалаю Ж., Сяргею К., Алене П., Артуру І. з Горадні.
Аляксандру П. са Жлобіна.
Валянціне С. з Жодзіна.
С.Л. з Клічаўскага раёну.
Людміле Р. з Капыльскага раёну.
А.К., Ю.К. з Крупскага раёну.
В.Ф. з Крычаўскага раёну.
Леаніду В. з Лагойскага раёну.
Сяргею Т., Рэгіне Д. зь Лідзкага раёну.
Алене А., Базылю К., Дз.С., О.С., Аляксею К., Т.Б. з Магілёва.
В.М., С.М., Л.Ц., Л.А., Івану М. з Маладэчна.
Фёдару Г. з Мазыра.
В.М. з Мастоўскага раёну.
А.Л. зь Мёрскага раёну.
Мікалаю С. зь Мядзельскага раёну.
Уладзімеру Г. з Наваполацку.
В.З., Н.А., Тацяне Х., Валер’ю С. зь Пінску.
Сяргею С. з Полацку.
Натальлі І. з Пухавіцкага раёну.
У.Ш., Р.Н., Н.Т., Анатолю П. з Салігорску.
В.В. са Смаргонскага раёну.
І.Г. са Смалявіцкага раёну.
Вадзіму Б., В.А. са Сьветлагорску.
Міхаілу С., са Слуцкага раёну.
Фёдару К. з Талачынскага раёну.
А.Р., Уладзіславу Л. з Шаркаўшчынскага раёну.
Ігару Л. са Стоўпецкага раёну.
Паўлу Л. з Хойніцкага раёну.
Мікалай Х., В.Б. са Шчучынскага раёну.
Івану Я., Д.Ш., Натальлі Г., Анатолю П., А.Д., Мікалаю П., Мікалаю Б., Віктару А., Крысьціне К., Віктару К., Надзеі С., О.С., Б.М., С.З., А.Г., В.С., Іван Р., Тацяне К., Юліі Ш., Андрэю М., А.А., І.В., Валянціне К., А.Ш., І.Г., А.П., Уладзімеру К., Ц., Фёдару К., У.Р., К.Дз., Т.Г., А.К., Станіславу Г., І.С., С.Р., І.Б., Нэлі А., Аляксандру П., А.Г., Надзеі С., Л.Ф., Галіне Я., Р.Н., Уладзімеру Ж., Юр’ю Б., М.А., Зьмітру С., І.Д., А.Н., В.Г., Іраідзе З., Марыі Б, І.В., Аляксандру П., В.М., Валянціне Т., К.К., В.Г., Ірыне Г., Віктару Ж., Ірыне В., Г.Л., М.Б., Н.Р., А.Ч., Анатолю Л., Івану К., А.А., Людміле Б., М.Б., В.Я., Леаніду Л., Лідзіі І., В.К., І.С., Сяргею Б., Валеру С., Сьвятлане Р., Алене К., Ніне К., Ігару Б., Ю.Г., І.Д., А.К., В.П., Дз.М., Валеру Ш., Сяргею П., Дз.Н., К.Г., Э.З., У.З., П.Д., М.Н., В.К., Л.Ш., А.К., Зьмітру М., Станіславу Р., Ігару Г., Уладзімеру С., Мікалаю С., Альбэрту С., Анатолю К., Максіму А., Валянціне Ш., Валер’ю З., Марыне Б., В.М., Яўгену К., Аляксандру Ш., Якубу Л., Івану Ф., Вользе Д., Андрэю Х., Але С., Васілю З., Фэліксу Г., Валер’ю К., Зінаідзе К., К.Ш. зь Менску.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84; e-mail: dastauka@tut.by; паштовы адрас: а/с 537, 220050, Менск;

2) просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перадказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас.**

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

КВИТАНЦИЯ

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — М.П. — Плательщик

# Янка Брыль: Гісторыя не паўтараецца


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Народны пісьменьнік **Янка Брыль** амаль ніколі не пагаджаўся на інтэрвію. У 1999 годзе журналісту «Нашай Нівы» ён не адмовіў, бо **Анатоль Прасаловіч** адмахаў пешшу 22 км да лецішча клясыка. Словы, сказаныя сем гадоў таму, і сёньня гучаць гэтак жа надзённа. Вось тое інтэрвію зь невялікімі скаротамі. Яно было прысьвечанае 60-годзьдзю ўзьяднаньня Беларусі, але выйшла далёка за рамкі гэтай тэмы.

**— 17 верасьня спаўняецца 60 гадоў з дня ўзьяднаньня Ўсходняй і Заходняй Беларусі. Як Вы цяпер гледзіце на тое ўзьяднаньне?**

— Ну, можна талкаваць і так, і так: ведаем цяпер мы пра пакт Рыбэнтропа-Молатава, ведаем, што ўсё гэта было сплянавана раней. Але вынік, які вынік? Што Беларусь узьяднана. Была разьдзёртая папалам, а цяпер узьяднана. Каб яна, Бог даў, утрымалася так, у самастойнасьці, у незалежнасьці, дык чаго б яшчэ хацець было?

**— Ці лічыце Вы магчымым, што ў будучыні Беларусь ізноў будзе падзеленая на дзьве часткі?**

— Упэўнены, што не. А якія для гэтага ёсьць падставы? Гісторыя, разьвіваючыся па сьпіралі, толькі набліжаецца, а не паўтараецца.

**— А ўзьяднаньне Беларусі й Расеі?**

— Ня будзе аніякага ўзьяднаньня. Бачыце, Ельцын сказаў: «Только в одно государство!» І ня будзе называцца Беларусяй гэтае «государство», будзе Расея. А наш ужо хоча ў віцэ-прэзыдэнты ці прэзыдэнты. Нават пагаворваецца, што ён можа стаць заступнікам Ельцына. Гэта ўсё ня мае пад сабой асновы і таму не адбудзецца.

**— Чаму частка беларускага народу падтрымлівае Лукашэнку?**

— З аднаго боку, з-за дасюлешняга калгаснага ладу жыцьця вясковага люду, а з другога боку, безумоўна, з-за несьвядомасьці нашай. Я вось жыву ў вёсцы і зьдзіўляюся, як яно можа спалучацца: з аднаго боку, такая сёньняшняя зьнешняя культурнасьць людзей, а з другога — такая цемра, што яшчэ і ў ведзьмаў верыць. Дык чаму ж ім не паверыць у ведзьмака?

**— Як, на Ваш погляд, будуць разьвівацца падзеі ў Беларусі ў бліжэйшыя гады?**

— Тут я Вам нічога не скажу. Можна як хочаш вадзіць пальцам па вадзе, але як яно будзе... Вы ж улічыце такі фактар, як фактар нечаканасьці. Такі паварот можа адбыцца, што бог яго знае. У сучаснай сытуацыі ў многім самі мы вінаватыя, бо трэба навучыцца саміх сябе крытыкаваць. Віна нашая ў нашай інэртнасьці, расхлябанасьці такой, бесхрыбетнасьці, п'янстве і тым, што зараз называюць сэксам, а раней звалася, прабачце, напрошваецца слова... Усё разам гаворыць, што сьветлым сілам, што дбаюць аб незалежнасьці, годнасьці, чалавечнасьці, цяпер вельмі нялёгка.

### Анатоль Прасаловіч: «Брылю тады было 82 гады, а мне 22»

Янка Брыль апошнія гады жыцьця ня дужа шанаваў журналістаў, і мала каму зь іх удавалася ўзяць у народнага пісьменьніка інтэрвію. Улетку 1999 г. гэта здолеў зрабіць «нашанівец» Анатоль Прасаловіч, які адшукаў Брыля на лецішчы пад Стоўпцамі.

«У той дзень у Стоўпцах я спазьніўся на патрэбны аўтобус на Беражан і вырашыў пераадолець патрэбны шлях пешшу. Брыля ўдалося знайсьці празь нейкую бабу Зіну.

Знайшоў лецішча, а мне паведамляюць: «Брыль не прымае!» Усё ж, даведаўшыся, што я прайшоў пешшу звыш 20 кілямэтраў, пісьменьнік згадзіўся на гутарку. Па-сялянску гасьцінна накрыў стол.

Брылю тады ўжо было 82 гады, а мне 22, і я быў надзвычай уражаны тым, што Іван Антонавіч заўжды прасіў, каб я выказаў меркаваньні па бягучых падзеях у Беларусі і ў сьвеце, ён ані разу не перабіў і не заспрачаўся, толькі ўвесь час уважліва слухаў.

Я баяўся, каб у Брыля не было нейкага старэчага маразму, які характэрны ягоным аднагодкам. Але як я памыляўся! Брыль не губляўся ні ў адным актуальным пытаньні, ён ведаў усе сучасныя навіны і тэндэнцыі. І пры гэтым апавядаў пра ўсё спакойна і дыхтоўна. Гэта быў чалавек са справядлівым пачуцьцем сьвету.

**Запісаў ЗП**

### Рыгор Барадулін: Брыль вучыў не хістацца на палітычных вятрах

У Вушачу ў маміну хату прыйшла сумная вестка: ня стала магіканіна, пайшоў з жыцьця Янка Брыль. Брыль быў настаўнікам для нас, маладых: вучыў не хістацца на палітычных вятрах, а ўрабляць добра ўдзірванелы палетак роднай літаратуры. Мы жартавалі, што глядзім на сьвет «з-пад Брыля»... Сьветлая памяць!

### Янка Брыль і Ліцэй

Сумная вестка пра сьмерць Янкі Брыля засьпела выкладнікаў і навучэнцаў Беларускага Ліцэю ў Гданьску. А дакладней — не ў самім Гданьску, а на паўвысьпе Гэль — акурат у той самай мясьціне, дзе Янка Брыль у складзе марской пяхоты Войска Польскага ў першыя дні верасьня 1939 г. прыняў удар нацыстоўскае ваеннае машыны. Усё гэтак сымбалічна... Узгадайма, што дэкрэт аб афіцыйным закрыцьці Ліцэю быў падпісаны тагачасным старшынём ураду Навіцкім акурат у дзень пахаваньня Васіля Быкава...

**Працяг на старонцы 4.**

# Апошні раз

**Анатоль Сідарэвіч** на разьвітаньне зь **Янкам Брылём.**

Тэлефонны званок ад Яго прагучаў 11 ліпеня.

— Толя? Я ў пятніцу паеду ў Крынічнае. Зайдзі да мяне. Тут у мяне падпісаная кніжка.

Гэтая кніжка — загалоўку яе я ня ведаў — была здадзеная ў выдавецтва «Про Хрысто» ўвесну сёлета, незадоўга да таго, як Ён меўся легчы на свой звычайны прафагляд у больніцы.

Гэтыя агляды праводзіліся штогод і ўспрымаліся як нешта будзённае. Да таго ж і самаадчуванне ў Янкі Брыля было нармальнае. Я быў у яго ў больніцы (здаецца, у пятніцу). Мы сядзелі на калідоры другога паверху і размаўлялі, калі падышла доктарка і сказала, што ім — доктарцы і Янку Брылю — трэба ісьці на абсьледаваньне сасудаў ног. Каля дзьвярэй ліфта на лесьвічнай пляцоўцы мы парукаліся, а на наступным тыдні Натальля Семашкевіч, Брылёва дачка, пад вялікім сакрэтам сказала, што бацьку з Рэспубліканскае клінічнае больніцы перавезьлі ў Бараўляны: у яго праблема з тоўстай кішкой. Пры гэтым слове —«Бараўляны» — я войкнуў, але здагадаўся спытацца, ці добры ў Старога апэтыт. «Добры», — адказала Натальля. І я зрабіў выснову, што ў Янкі Брыля або кіста, або паліп. І падумаў, што Пісьменьнік убачыць сваю кніжку.

Гэтая таямніца — што Пісьменьнік ляжыць у больніцы, — ня выйшла за межы вузкага кола людзей. Натальля апавядала, як маецца яе бацька ў Бараўлянах, што ён ляжыць у агульнай палаце побач з мэханізатарам з Лагойскага раёну, у якога праз кожнае слова мат... Потым стала вядома, што яго, удзельніка вайны, нарэшце здагадаліся пакласьці ў палату для ўдзельнікаў вайны... Праўда, спатрэбілася, каб адна супрацоўніца сказала, што Пісьменьнік сапраўды браў удзел у вайне.

Калі Іван Антонавіч вярнуўся з Бараўлянаў у больніцу на менскай вуліцы Энгельса, я рады быў яго вітаць на гэты раз на калідоры пятага паверху і нават выдаць таямніцу ягонага бараўлянскага бытаваньня. Напісаў электронны ліст пра гэта Васілю Сёмуху, якога — я заўсёды тое ведаў — Іван Антонавіч любіў і як чалавека, і як літаратара. А па тэлефоне паведаміў Міхасю Скоблу, бо яго Іван Антонавіч таксама любіў.

А потым быў санаторый.

Што з санаторыю Брыль вярнуўся дадому, — пра тое я ведаў. Празь дзеньдругі я пазваніў яму і спытаўся: «Pan siedzi przy biurku?» — «Nie, — быў адказ, — przy stole. Będę jadł obiad». Нашы размовы з польскімі ўстаўкамі нікога не дзівілі. Наадварот, кагосьці зьдзівіла б, што мы падчас гутаркі абышліся хоць без аднае польскае фразы. Нас яднала, у прыватнасьці, і любоў да польскага краснага пісьменства (зрэшты, як і да ўкраінскага, да расейскага, да ўсякага іншага, не кажучы пра тое, што найперш мы любілі сваё).

Было запрашэньне наведаць Яго. І я прыкідваў, калі змагу паехаць на вуліцу Дразда, каб пасядзець зь Ім не хвілінудругую, а, як гэта павялося, некалькі гадзін. Я разумеў, што пасьля сьмерці Ніны Міхайлаўны Івану Антонавічу, бывае, няма з кім паразмаўляць. Ня будзе ж ён увесь дзень чытаць і пісаць. І сябрытаварышы ня кожную гадзіну тэлефануюць... Апрача таго, з гэтых размоваў быў мне спажытак: інфармацыя, факты пра былое, пра пісьменьнікаў, дзеячаў мастацтва. Кажучы словамі Томаса Мана, Ён быў багаты на гісторыі стары.

І вось прагучаў тэлефонны званок: Іван Антонавіч не пытаўся, калі я завітаю, а клікаў мяне да сябе.

Я быў у яго 13 ліпеня.

Гэты дамафонны сыгнал, голас гаспадара кватэры, расчыненыя дзьверы саракавой кватэры і — «Здароў», і шырокая вялікая далонь, у якой хаваецца мая... далонька? А потым тапкі... Не, на гэты раз я хадзіў у адных шкарпэтках. І фатэль ад левага боку пісьменьніцкага стала (бюрка). А потым прыйшла Натальля. (Яна звычайна прыходзіла да бацькі ў абедзенны перапынак у аўторкі і чацьвяргі, а разам зь сястрою Галінаю — штосуботы.) Натальля Іванаўна згатавала для нас даўно забытую мною зацірку з малаком і сырнікі, а сама пайшла на працу ў сваё выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Абед, як заўсёды, быў смачны. Іван Антонавіч падбіваў мяне, каб на дэсэрт я пакаштаваў сотавага мёду, які прывёз Віктар Карамазаў. Скрыль гэтага мёду ляжаў на талерцы. Але я на спакусу не паддаўся.

А потым мы зноў сядзелі ля таго стала ў тым пакоі, дзе фатаздымкі пісьменьнікавых маці і бацькі, брата Міхася, партрэты Льва Талстога і Янкі Купалы, бюст Якуба Коласа. Дзе стаіць шафа з улюбёнымі кнігамі. І са здымкамі ўнукаў. Пра іх — Дануту, Вольгу, Міхася, Антося, пра маленькую Дарку — дзед і прадзед зь любасьцю гаварыў і цяпер. Неяк заранулі ў размове і ваенную тэму. Іван Антонавіч дастаў з шуфляды здымак свайго таварыша па зброі, якому нядаўна польскі ўрад надаў ранг паручніка. Я ведаў пра Фляр'яна з Глыбокага (няхай даруе мне стары жаўнер, што забыў у гэтую хвіліну ягонае прозьвішча) і раней. І бачыў здымак маладзенькіх жаўнераў, зроблены ў 1939-м на беразе мора пад Гдыняй амаль напярэдадні вайны. З гэтага ж, сёлетняга, на мяне глядзеў ужо даўно немалады чалавек з маладымі вачамі ў бэрэце зь Белым Арлом і адзнакамі паручніка Войска Польскага. І Іван Антонавіч згадаў, як ён, навабранец,

**Працяг са старонкі 3.**

**І ўсё ж такі хочацца ўзгадваць тое, што зьвязвае Ліцэй з жывым, гэткім незабыўным Брылём. Помніцца, як у першай палове 90–х гадоў Янка Брыль разам са сваёй дачкой Наталяй Семашкевіч ахвяраваў у ліцэйскую бібліятэку вялікую колькасьць добрых і каштоўных кніг (пасьля захопу ліцэйскага будынку АМАПам лёс вялікае іх часткі, на жаль, невядомы). Гэтыя кніжкі прыносілі дадому і чыталі Ільля Сін і Міхась Баярын, Раман Падаляка і Прымавера, Сяргей Сматрычэнка і Ўсяслаў Шатэрнік, Глеб Лабадзенка і Мікалай Астрэйка...**

**Добра памятаецца візыт Янкі Брыля ў Ліцэй у 2001 г. Майстар з ахвотай і вялікім зацікаўленьнем правёў больш за чатыры гадзіны зь ліцэістамі і выкладчыкамі, адказаў на безьліч пытаньняў, нават крыху быў засьпяваў... Тады здавалася, што гэткія сустрэчы будуць яшчэ і яшчэ. Ня выпала...**

**Лявон Баршчэўскі, Гданьск**




**Янка Брыль у часе канфэрэнцыі «Разнастайнасьць моваў і культураў у кантэксьце глябалізацыі», 2002.**

нудзіўся ў нядзелю ў казарме, і раптам зь яе далёкага кутка пачуў гукі гармоніка і роднае, незабыўнае:

А Лявоніху Лявон палюбіў…

Малады жаўнер Брыль стрымгалоў кінуўся на гэтыя гукі. І так пазнаёміўся з Флёркам…

Наша размова перапынялася тэлефоннымі званкамі. Ніна Мацяш паведамляла, што ў яе Белаазёрску 29 градусаў гарачыні. Хрысьціна Лялько вяла гутарку пра выдавецкія справы і справы часопісу «Наша вера» (хвілінку з рэдактаркай пагаманіў і я). Патэлефанаваў Васіль Зуёнак. А яшчэ была размова з пані Калесьнікавай, удавою Ўладзімера Калесьніка. «Зосечка», — зьвяртаўся Пісьменьнік да яе...

Ага, найперш я атрымаў кніжку. Тую самую, здадзеную ў набор увесну. «Парастак». Я разглядаў прыгожую вокладку. І калі пазваніла Хрысьціна, я пахваліў аздабленьне кніжкі і рэдактарцы. На кніжцы была дэдыкацыя: «Анатолю Сідарэвічу на сорак першым годзе сяброўства». «Паглядзі, — сказаў Пісьменьнік, — ці няма якое памылкі». — «Я знаёмы з вамі ўжо сорак другі год». Іван Антонавіч узяў кніжку і ўнёс у дэдыкацыю папраўку. А яшчэ Ён даў мне пакет з асобнікамі кнігі для «дзеяслоўцаў» — супрацоўнікаў рэдакцыі часопісу «Дзеяслоў». Гэты пакет я мусіў перадаць Міхасю Скоблу, які пад той час «недзе прапаў».

Калі Пісьменьнік вярнуўся з Бараўлянаў і ачуньваў у больніцы, я спытаўся у Натальлі, ці ёсьць у Яго цікавасьць да жыцьця, да літаратуры, да падзеяў у Беларусі і ў сьвеце. «А як жа?!» І я парадаваўся: значыць, усё непагана, усё добра.

Мы размаўлялі пра літаратуру. Яшчэ пасьля Бараўлянаў, у больніцы, Іван Антонавіч дзяліўся сваім адкрыцьцём, якое ён зрабіў дзякуючы дачцэ Галіне. Гэта была проза Івана Шмялёва. Двухтомнік пісьменьніка ляжаў на бальнічным падаконьніку. Цяпер Ён разважаў пра мову і пра стыль Івана Шмялёва. Заўважыўшы, што пісьменьнік аж надта праваслаўны, Ён шукаў падабенства паміж Шмялёвым, Мікалаем Лясковым ды Іванам Буніным. Падзяліўся яшчэ адной радасьцю — новаю кніжкаю Віктара Карамазава. «Пра Антона Бархаткова? — спытаўся я. — Той раз, як я быў у вас, прыходзіў Віктар Філімонавіч і паказваў гэтую кніжку. Добра выдадзеная». — «Не, гэта новая кніжка. Пра Гаўрылу Вашчанку». Паразмаўлялі пра апошні нумар «Дзеяслова»: пра ўспаміны Ніла Гілевіча і Ўладзімера Арлова, публіцыстыку Віктара Казька ды Сяргея Абламейкі. «Апавяданьні Валодзі Сьцяпана чытаў?» Пачуўшы адмоўны адказ, параіў абавязкова пачытаць: добрая проза. Я прачытаў пакуль што першае апавяданьне. Валодзю трэба павіншаваць: гэта проза добрага густу, добрага стылю. Думаў, напішу пра гэта ў лісьце да Івана Антонавіча, падзякую за падказку.

Згадалі ў размове і маладога гісторыка Андрэя Вашкевіча з Горадні. І яшчэ аднаго гісторыка з таго самага места, які наважыўся пісаць пра Пятра Сеўрука — заходнебеларускага паэта, талстоўца, пацыфіста, неардынарную асобу. Іван Антонавіч пераказаў мне зьмест адказу гэтаму гісторыку, які хацеў бы зрабіць з Сеўрука славянароса. А потым паказаў тэкст, які ён адмыслова напісаў для будучае кнігі пра народную артыстку Марыю Захарэвіч.

Гэта быў першы тэкст пасьля больніцы і санаторыю. Там, сказаў Іван Антонавіч, ён не пісаў. «За вас маліліся. Наш бацюшка Андрэй Абламейка і пры сугубай екценьні, і пры вялікім уваходзе, з Дарамі ў чашы». — «З гэтага боку ў мяне ўсё было добра». І апавёў, як за яго ставілі сьвечкі ў касьцёлах.

(У суботу 22-га, калі пісьменьніка зь лецішча прывезьлі ў больніцу, пра гэта ведалі толькі родныя і мэдыкі. На гэты раз малітвы грэка- і рыма-каталікоў не гучалі. А калі б гучалі?..)

І зноў, вярнуўшыся да літаратуры, Ён як пахваліўся — сказаў, што ў больніцу прыходзіў да яго Васіль Сёмуха і прынёс пераклад рамана Клаўса Мана. Потым я пісаў Васілю Сяргеевічу пра цеплыню ў голасе Старога і што Стары турбаваўся, ці атрымаў ён, Сёмуха, «Парастак». І прачытаў адказ: «Кніжку Брыля атрымаў і адным духам — прачытаў. Ня ведаю сам, чаму я так люблю ягоную прозу: просьценька, шчыра, без выкрунтасаў, элемэнтарна, як карова ў цэркві, а от жа кожны раз за сэрца бярэ. Справакаваў Брыль цэлы паток мініяцюраў, і вось ужо хто толькі ні піша, а ніхто так напісаць ня ўмее». І вяртаючыся да свайго візыту ў больніцу: «Мы з Брылём добранька пагутарылі, мне аж на душы пацяплела». А пра тое, што ён атрымаў кніжку, Васіль Сяргеевіч абяцаўся патэлефанаваць Натальлі, каб яна перадала гэтую вестку свайму бацьку ў Крынічнае.

Ідучы ад Янкі Брыля, я падумаў, што Ён адʼяжджае ў Крынічнае 14 ліпеня — у Дзень узяцьця Бастыліі. І пашкадаваў, што не пажартаваў з гэтае нагоды. І думаў: я размаўляў з ранейшым Брылём. Стары пасьля бальнічнае эпапэі і санаторыю пасьвяжэў з твару, нават памаладзеў. Пра гэтае сваё адкрыцьцё я наважыўся быў сказаць дочкам Івана Антонавіча, але вырашыў устрымацца, успомніў народнае: «У добры час сказаць, а ў ліхі памаўчаць».

14-га Янка Брыль паехаў у роднае Панямоньне. 15-га раніцай я выехаў у Полацкі раён і далучыўся да пілігрымаў, якія ўжо каторы дзень ішлі ад Усьпенскае горкі ў Віцебску, дзе забілі ўладыку Язафата Кунцэвіча, да Сьвятое Сафіі ў Полацку, дзе цар Пётар І забіў уніяцкіх сьвятароў.

У Сьвятой Сафіі, дзе нам дазволілі пабыць хвілін дзесяць, я згадаў адзін момант з размовы (ня ведаў, што апошняй) зь Янкам Брылём. Пра тое, як Валодзя Ягоўдзік, прачытаўшы ягонае эсэ «Сустрэчы з Сафіяй», зьмешчанае ў кнізе «Парастак», абяцаў у верасьні звазіць Пісьменьніка ў Полацак. Пасьля малітваў у саборы я падумаў: Стары можа стаміцца, яму трэба будзе недзе паабедаць. І вырашыў я спытацца ў айца Лявонція з Барысаглебскага манастыра ў Полацку, ці не прывеціць брація Янку Брыля. Але размову з айцом Лявонціем я адклаў на потым. Пішучы пасьля пілігрымкі ліст да асабіста мне незнаёмага Андрэя Вашкевіча, я напісаў яму: мы можам сустрэцца ў Крынічным 4 жніўня, калі будзем сьвяткаваць 89-ты дзень нараджэньня Івана Антонавіча. Вось у гэты дзень і пляную я пагутарыць зь Пісьменьнікам пра ягоную паездку ў Полацак і пра магчымы адпачынак у манахаў-студытаў, а потым паразмаўляць і з айцом Лявонціем...

Ня будзем мы сьвяткаваць у Крынічным дзень нараджэньня Янкі Брыля. Не сустрэнуся я там зь сябрамі. Не палюбуюся я на тыя панямонскія краявіды.

Ня зьдзейсьнілася мара пісьменьніка яшчэ раз зьезьдзіць у Полацак да чыстае «ў сваёй непераможнай сьвятасьці» Сафіі...

# Радзіма яго дарагая

Шклоўшчына сёньня — адзін вялізны аграгарадок. Аляксандар Лукашэнка не шкадуе грошай для разбудовы сваёй малой бацькаўшчыны. Рэпартаж **Сяргея Мікулевіча, Барыса Тумара.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Жыхара Полаччыны Шклоўшчына ўразіць прасторам. Лясоў тут мала, у вайну партызанаў амаль не было. Скрозь палі, і вёска на вёсцы сядзіць. Жыхара Случчыны Шклоўшчына ўразіць усюдыісным Дняпром. Ён увесь час трапляецца на шляху, яго пераяжджаеш то па адным, то па другім мосьце.

Уладзімер Караткевіч даводзіў, што ў падняпроўцаў ёсьць свой кшталт. Што жыцьцё ля вялікіх рэк накладае адбітак на людзей, дадае ім дынамізму й пэўнасьці. Праўда, сваіх Загорскіх і Выліваха ён пісаў з рагачоўцаў. Але і Шклоўшчына — край урадлівы, густанаселены, з даўняй гісторыяй. Толькі імем агульным Шклоў зрабіўся зусім зь іншай прычыны. Шклоўшчына дала краіне першага прэзыдэнта, Аляксандра Лукашэнку. А што Аляксандар Лукашэнка даў малой радзіме?

## Горад прасторных плошчаў

У Шклоў найлепей уяжджаць аксамітным летнім вечарам з боку аршанскае шашы. Зьлева зіхаціць агнямі стартавая пляцоўка А.Лукашэнкі — саўгас «Гарадзец». А за Дняпром адкрываецца від на места. Падсьветленыя, як на менскім праспэкце, будынкі, сьпічастая вежа ратушы,аграмадзіна праваслаўнай царквы. Перад адштукаваным гатэлем пераліваецца бэзавымі колерамі фантан з падсьветкай — такіх і ў Менску няма.

Пры гэтым у гатэлі, як і ва ўсім горадзе няма гарачай вады — адрубаюць на лета. Яшчэ ў гатэлі пахне Савецкім Саюзам. Старыя ложкі нязносна рыпяць. У прыбіральні няма туалетнай паперы. Пасьнедаць можна, толькі калі загадзя замовіць сьняданак у бармэна.

Затое якія прасторныя ранішні Шклоў! Яго цэнтральныя вуліцы ператвораныя ў праспэкты, што лучаць каскад прасторных плошчаў. Перад Ратушай адна, за Ратушай другая. Між царквой і крамамі трэцяя, між гатэлем і райвыканкамам чацьвертая. Між Домам культуры, паркам і базарам пятая... Толькі яны пустыя. Гэткі беларускі адміністрацыйны клясыцызм. Узорнаму асяродку для жыцьця чалавека не хапае насельнікаў. Каб яшчэ машыны параздаваць шклоўцам, тыя плошчы запоўніць... Бо гужавому транспарту ў цэнтар гораду ўезд забаронены адпаведнымі знакамі. Ці саслаць сюды бунтоўных берасьцейскіх таксоўшчыкаў?

Шклоўскія плошчы з тае ж кагорты, што й сьвятлафоры ва ўзорна паказальных вёсках калгасаў-мільянэраў машэраўскай пары. Практычнай карысьці ніякай, затое прыгожа.

Яшчэ ў сонечным сьвятле заўважна, што з фантанам нешта напартачылі, і ён пералівае праз край. У сырое надвор'е на плошчы побач зь ім утвараецца вялікае балота, паўшэптам паведамляюць месьцічы.

## Шклоўскія эксклюзівы

Ратуша ратуе шматпавярховы аграгарадок ад бязьлікасьці. «Яна ўнесеная ў амэрыканскі каталёг помнікаў, — з гонарам заяўляе жыхарка гэтага самага антыамэрыканскага кутка Эўропы. — А гадзіньнік на вежы аднаўляў асабіста наш дэпутат Уладзімер Канаплёў». Абапал уваходу ў ратушу — футбольная і хакейная пляцоўкі школьнага ўзроўню. Аказваецца, тут месьціцца не гарадзкая адміністрацыя і не музэй, а шклоўская гімназія. І гэта добры выбар. Каб яшчэ яе ўнутраны дворык ня быў зроблены «пад эўра» — без увагі на датрыманьне агульнага архітэктурнага стылю. З вуліцы ж не відаць.

Яшчэ адно ранішняе адкрыцьцё — гатэль называецца «Раднічок» не з прычыны русіфікацыі якойсьці там «Крынічкі», а ў гонар славутага сорту гуркоў (так тлумачыць нам работніца Дому культуры). Парнікі пад іх сапраўды стаяць у кожным другім двары. Толькі тая ж жанчына паведамляе, што з кожным годам даюць яны ўсё менш прыбытку. «Масква іх болей не бярэ». Гуркі на базары сьвяжуцькія па 800 рублёў за кг.

Краязнаўчага музэю ў Шклове няма. Былы яго будынак на замку. У Доме культуры, куды ён мусіў пераехаць, выстаўляюць Рэрыха і творы мясцовых народных майстроў. Там можна набыць абсалютна эксклюзіўныя вяхоткі, зьвязаныя з суровых ільняных нітак. Такія маглі б стаць брэндам Шклоўшчыны

ўпоравень з гуркамі. Уявіце сабе: «Шклоўская вяхотка! Будзь здаровы, як...» І фота славутага земляка.

## Магілёўскае божышча

Пакуль вышэйпамянёнае фота ўпрыгожвае выставу «Беларусь. Дзяржаўнасьць. Незалежнасьць» у раённай бібліятэцы. А яшчэ — убогі кніжны аддзел цэнтральнага ўнівэрмагу. Там на правох турыстычнага эксклюзіву прадаюцца яго партрэты ўсіх магчымых памераў і якасьці. Коштам ад 300 да 41 тысячы рублёў.

Побач з ратушай паўстала Алея герояў — маленькая копія магілёўскай. Па адной мармуровай стэле на кожнага з шклоўскіх Герояў Савецкага Саюзу і Сацыялістычнай працы, падсьветка і цуд савецкай бранятэхнікі ў глыбіні сквэру. На ліхтарнях Алеі трапляюцца налепкі «За Свабоду». Гэтыя налепкі і значкі — адзін з найбольшых набыткаў сакавіцкіх падзеяў. Хоць нешта ды яднае сёньня ўсіх прыхільнікаў дэмакратычных зьменаў. Моладзь з значкамі сустракаецца і ў Шклове.

Яшчэ адзін шклоўскі цуд — прэстыжны шматпавярховік ля Дому саветаў, збудаваны за тры месяцы перад «Дажынкамі». Гэтулькі гадоў прайшло, а ён усё яшчэ стаіць! — з гонарам кажуць шклоўцы.

Сёньняшняя адміністрацыйная пустэча ў гістарычным цэнтры ня вяжацца з вобразам старога Шклова, места даўняга і слаўнага, што належала Гаштольдам, Хадкевічам, Чартарыйскім. За час існаваньня горад пасьпеў тройчы зьмяніць месца. Першае — гарадзішча Стары Шклоў за чатыры кілямэтры ад сучаснага. Там калісь былі знойдзены вядомы шклоўскі ёлуп, якога ў апошніх падручніках цнатліва перайменавалі ў «магілёўскае божышча». Другі Шклоў стаяў на ўзгорках за вёскай Рыжкавічы. Там ужо некалькі гадоў вядуцца ўпартыя раскопкі. На гэтым месцы плянуецца адбудаваць старую браму і адчыніць археалягічны музэй пад шкляным дахам — кшталту берасьцейскага. Пытаньне, чаму пачынаюць менавіта са Шклова, а не, напрыклад, з Полацку, павісае ў паветры.

Кіруе раскопкамі сёлета археоляг з Магілёўскага дзяржунівэрсытэту Вольга Ляўко. Ні яна, ні яе студэнты не гавораць з намі па-беларуску.

Трэці Шклоў абжывае сёньняшняе месца з XVIII ст. Некалі ён належаў фавараыту царыцы Кацярыны князю Пацёмкіну. Пасьля гаспадар зьмяніўся, але справа яго жыве дагэтуль.

## АРЛагарадкі

У Рыжкавічах, дзе жыве Галіна Лукашэнка, прапускны рэжым трохі памякчэў апошнім часам. «Раней, ледзь спынісься ля хаты пад зялёным дахам, адразу падыходзілі і правяралі дакумэнты», — расказваюць шклоўцы. Але на вуліцы, на якой яна жыве, дагэтуль стаіць знак «Уезд забаронены». І ня толькі гужавому транспарту.

У Рыжкавічах вядзецца інтэнсіўнае будаўніцтва. Сёньняшняя візытоўка Шклоўшчыны — зусім ня ратуша. А новыя стандартныя дамкі, засыпаныя жвірам вулкі, роў бульдозэраў, варушэньне соцень работнікаў. Край узорных аграгарадкоў — вось што такое Шклоўшчына сёньня.

У Гарадцы «супэраграгарадок» ужо стаіць. Пад Шкловам — будуецца. У вёсцы Вялікі Мяжнік разам з хатамі ўзьнімаюцца гіганцкія фэрмы. Прычым усе аграгарадкі, як запавядаў князь Пацёмкін, будуюцца ўздоўж дарог. Нічога, што ня самае камфортнае месца для жыцьця, затое эфэктна.

Працяг на старонцы 8.



**Шклоўская ратуша – адзіная, што захавалася ў першасным выглядзе.**



**Уезд коньмі ў цэнтар Шклова дыскрэдытуе РБ.**

# Радзіма яго

**Працяг са старонкі 7.**




**«...до основанья, а затем...».**

А за кілямэтар ад Старасельля з бліскучым аграгарадком туліцца засьценак Гвалтоўнік, да якога і дарогі людзкай няма.

Апроч Гвалтоўніка, ёсьць на Шклоўшчыне вёска Хлусы, а яшчэ — Пранцаўка і Апалёнаўка. Народ тут здаўна жыў з гумарам і бяз комплексаў. Нават Александрыя — не Александрыя зусім, як высьветлілася, а Аляксандрыя. Так пазначана на ўсіх дарожных указальніках. І як Александрыя Эгіпэцкая была дыямэнтам гарадоў імпэрыі Македонскага, так Александрыя Шклоўская — эпіцэнтар аграбудаўніцтва. Прыежджых работнікаў болей за мясцовых жыхароў (164 двары, 333 жыхары па стане на 1995). У самы сквар, пад пякучым сонцам будаўнікі адначасова кладуць аграходнікі, капаюць агратраншэі пад агратрубы, разбудоўваюць школу, ставяць аградамкі. І яшчэ нешта сярэдняе між трохпавярховым парніком і двухпавярховым спарткомплексам. Што ж гэта будзе? Асартымэнт мясцовай прадуктовай крамы яўна шырэйшы, чым у суседніх Ляўках. Нават гуркі прывазныя — з базы.

> «Я ішачыў усё жыцьцё і паставіў хату. Другі прапіваў усё — і яму цяпер аграгарадок бясплатна».

У прынцыпе, у Александрыі, Гарадцы, Межніку Лукашэнка задае нармальны цывілізацыйны стандарт. Кожная беларуская вёска мусіла б стаць такой. Але «доўга гэта не пратрымаецца, — кажа адзін з шклоўскіх сьвятароў. — Усю гэтую шклоўскую прыгажосьць людзі атрымалі за так. Гэта дом, збудаваны на пяску, а не на камені». Устойлівы той дабрабыт, які зароблены цяжкой працай, а ня той, які зь неба валіцца. Дабрабыт усьвядомлены і асэнсаваны. Ня толькі ў тым сэнсе, што можа падтрымлівацца без датацый звонку, патрэбу ў якім чалавек усьведамляе. Туалет ніколі ня будзе чыстым, пакуль чалавек не ўсьвядоміць патрэбы ў тым, каб ён быў чысты. Туалетная папера такі мусіць папярэднічаць фантану з падсьветкай.

Нас найбольш уражвае 70-гадовы дзядзька ў Межніку: «Я ішачыў усё жыцьцё і паставіў хату. Другі прапіваў усе грошы — і яму цяпер аграгарадок бясплатна. І дзе ён пасьля гэтага што за свае грошы паставіць? Наставілі дамоў, няма кім засяляць. Прывозяць туды жыць алькаголікаў з гарадоў, цяпер хату страшна пакінуць».

## Крыніца прэзыдэнцтва

Лукашэнка вырас не ў самой Александрыі, а ў Александрыі Другой — гэта кілямэтар убок, за чыгункай. Александрыя Другая паўстала ў 1938 годзе ў выніку сьцягваньня хутароў у адну вёску, якая складаецца з аднае вуліцы.

«Там была хатка-пяцісьценачка. Хто яе знае, калі яна прапала. Мы і ня ўбачылі. Мабыць, ноччу», — успамінае аднавяскоўец. Пра месцазнаходжаньне і памеры першага жытла пер

### 1481 аграгарадок

**Паводле дзяржаўнай праграмы разьвіцьця вёскі распрацаваны 1481 генэральны плян аграгарадкоў. На Берасьцейшчыне плянуецца ўзьвесьці 221 аграгарадок, Віцебшчыне — 256, Гомельшчыне — 238, Гарадзеншчыне — 239, Меншчыне — 325 і на Магілёўшчыне — 202.**

**Мяркуецца збудаваць ня менш за 50 тыс. жылых дамоў (кватэраў) сярэдняй агульнай плошчай 70 кв. мэтраў, у тым ліку ў Берасьцейскай вобласьці – 7530 дамоў, Віцебскай – 9000, Гомельскай – 8800, Гарадзенскай – 6590, Менскай – 9900, Магілёўскай – 8100 дамоў.**

**Агульная сума выдаткаў на рэалізацыю Праграмы складае 69,7 трлн руб. Сярэднестатыстычны кошт аднаго дамка ў гарадку складае каля 40 млн рублёў.**

### ERRATA

**У «НН» №26 у артыкуле «Драма нацыянальнага менталітэту» перакладчык зрабіў нечаканую памылку.** У характарыстыцы майстэрства нашага выдатнага акцера Генадзя Аўсянікава слова «органичный» ён зразумеў як «ограниченный» — і пераклаў яго на беларускую мову як «абмежаваны».

Просім прабачэньня ў любімага акцёра, чые творчыя магчымасьці насамрэч неабмежаваныя, і ў чытачоў таксама. Зробім толькі дзьве маленькія заўвагі:

1. Ужо існуе новая генэрацыя беларусаў, якая ведае родную мову лепей за расейскую (наш перакладчык – адзін з іх).
2. Аўтар, Аляксандар Фядута, падчас супрацоўніцтва з нашай газэтай вывучыў родную мову ўжо настолькі, што сам знаходзіць памылкі ў перакладах уласных артыкулаў. Спадзяемся на тое, што ў хуткім часе ён будзе пісаць у «Нашу Ніву» безь перакладчыка.

# дарагая



шага прэзыдэнта сьведчаць толькі ледзь прыкметныя ўзвышэньні на месцы падмурку і ганка. Паводле іншае легенды, мясцовае начальства тэлефанавала Лукашэнку і пыталася: мо паставіць на сялібе новую акуратную хату? «Вам што, грошы няма куды дзяваць?» — адказаў зямляк. І замест хаты зрабілі акуратную альтанку з лавамі, сталом і нават электрычным сьвятлом. Праўда, разэткі ўжо павыдзірала нечая зладзейская рука. Пад альтанкаю цьвіце корч шыпшыны. Побач пара яблынь ды старая вярба пры весьніцах. У куце — яшчэ адна альтаначка. Сардэчна, сьціпла, не паніязаўску, трэба сказаць. Дарожкі пасыпаныя жвірам. І ўвесь мэмарыял. Калі, вядома, не лічыць часткай мэмарыялу цьвёрдую дарогу праз вёску, на месцы колішняй непралазнае гразі. Або плот, які трапіў сюды

Працяг на старонцы 10.

**АНТ пра аграгарадок у Александрыі**

«Самы сапраўдны конкурс на вакансіі трактарыстаў — гэта ўжо новы павеў у сельскай гаспадарцы. У абласных і нават рэспубліканскіх газэтах цяпер можна прачытаць такую аб'яву: «Александрыйскай гаспадарцы патрабуюцца мэханізатары. Жытло прадастаўляецца». Але гэта яшчэ ня ёсьць гарантыяй працаўладкаваньня. Навабранцы павінны прайсьці выпрабавальны тэрмін».

**www.ont.by**



Бальшыню аграгарадкоў ставяць уздоўж дарог.

# Радзіма яго дарагая



Альтанка на месцы сядзібы Лукашэнкаў.

Працяг са старонкі 9.

па дзяржаўным разьмеркаваньні.

Праўда, найбольшы цуд Лукашэнкавай радзімы схаваны ад вока павярхоўнага турыста. «Вы на крыніцы былі? Зьезьдзіце», — загадкава раілі александрыйцы. «А што за крыніца? Сьвятая?» «Сьвятая, — сьмяецца дзядзька. — Тама Ён адзін раз ногі памачыў...»

## Прэзыдэнцкі вігвам

Палявая дарога канчаецца ля зарослага кустоўем адхону. Уніз да ракі Ўльянаўкі зьбягаюць прыступкі з парэнчынай трымацца. Бо ад убачанага сапраўды можна ўпасьці. Першае, што бачыш, — дзесяцімэтровы вігвам. Калі вігвамы бываюць драўляныя. Ашаляваная будыніна мае дзьвюхстворчатыя дзьверы, мураваную падлогу. Пасярэдзіне — кастрышча з прыспасобай класьці шампуры. «Сюды нават з гораду прыяжджаюць аддыхаць. Маладзёж», — кажа тутэйшы чалавек.

Вада ў плыткай Улянаўцы крынічная. У натаптаным месцы ля берагу відаць гарэлачныя цэтлікі — тут наведнікі вігваму астуджаюць напоі. Цераз раку перакінуты акуратны масток. А вакол гэтага пункту культурнага адпачынку стаіць дзікае някошанае бадыльлё.

Над крыніцай, зь якой вёска некалі брала ваду, акуратная калодзежная стрэшка. З празрыстым шкляным верхам. Крыніца стаіць поўная. Рукою дастанеш, каб зачарпнуць смачнае вады. На ёй выгадаваўся Лукашэнка. Нездарма прэзыдэнтам ён прыяжджаў да сваёй першай крыніцы. У каго з нас няма такой? Але і шашлычны вігвам — таксама частка эпохі, іншы бок мэдаля, гатовы экспанат у будучы скансэн А.Р.Лукашэнкі.



Найстарэйшая жыхарка Александрыі пражыла жыцьцё насупраць Лукашэнкаў.

## Ён сам прыйшоў

Ці бывае ў Александрыі Лукашэнка? «Вядома, у той самы год, як яго выбралі, ён з трыма ахоўнікамі сюды на лыжах прыйшоў», — кажа тутэйшая кабета. Праўда? Легенда? «Яшчэ прылятаў на верталёце, — дадае бабуля. — Вунь там сядаў верталёт. Ішоў па вёсцы, са мной паздароўкаўся, ахове сказаў, каб адышлі. Мне ля яе ахова ня трэба, сказаў».

Бабуля — суседка Лукашэнкаў. Трыццаціградуснай гарачынёй яна поле кветнік не разгінаючыся, нават нялёмка нам яе адрываць. Аказалася, што не разгінаецца, бо такая сагнёная і ёсьць. «А скуль вы, паны далёкія?» — пытаецца. Ёй 90 гадоў, і Саша гадаваўся пры ёй.

«Што вы тут у бабушкі выпытваеце?» — падае го

«У той самы год, як яго выбралі, ён з трыма ахоўнікамі сюды на лыжах прыйшоў».

лас яе дачка, якая прыехала на лета з Барані. Яны трохі напалоханыя тым, што напісала «Камсамолка»: нібы Лукашэнка вырас у іх бабулі на руках. Людзі ў Александрыі пабойваюцца гаварыць. «Наш прэзыдэнт маладзец, — кажа бабуліна дачка. — Дарогу зьдзелалі, астаноўку зьдзелалі, заборы во якія зьдзелалі. Але дамоў людзі ў вёсцы не купляюць, дарма што яна знакамітая. Каб яшчэ дзярэўню адстроілі… Бо тута якіх можа шэсьць дамоў і ё цяпера, што людзі жывуць... На месцах прэзыдэнту мяшаюць. Мы во прасілі бабе печ адрамантаваць, бо зь нёба цэгла валіцца, дык ніхто й пальцам не паварушыў. А прэзыдэнт маладзец: на фэрме матцы заўжды памагаў і ў хаце…» Вы хоць не пішыце няпраўды, просіць яна наастатак. Пахне суніцамі. Гэта бабуліна праўнучка зрабіла сабе сунічную маску.



Вігвам над крыніцай прэзыдэнцтва.

Зьязджалі з Александрыі-2 з адчуваньнем лёгкай крыўды за... Быкава. У пісьменьніка ж ніхто не папытаўся, і на яго радзіме ў Бычках цяпер стаіць не густоўная альтанка, у якой добра думаецца пад пошум дрэваў, а новая лякіраваная пацёмкінская хата.

…Між Александрыяй і Копысьсю, на месцы аднаго з апошніх у Беларусі пароmaў, будуецца бэтонны мост. Гіганцкія быкі, як калёны Парфэнону, уздымаюцца над нешырокім яшчэ Дняпром. Копысь належыць ужо да Аршанскага раёну, і тут няма ніякіх прыкметаў аграбудаўнічае ліхаманкі, апроч абкладзенага сайдынгам «Бару» з чабурэкамі. І платоў. Платы цяпер стаяць бэтонныя, штыкетныя, харошыя, бясплатныя па ўсёй краіне. Машэраўскай якасьці!

З магутных валоў копыскага замчышча Александрыя за ракой здаецца вялікім мурашнікам. І ўспамінаецца Эклезіяст: «І гэта мінецца...».

**Здымкі Андрэя Лянкевіча**



# За што забілі беларускага хлопца?

Сталі вядомыя акалічнасьці гібелі 20-гадовага беларускага студэнта Аляксея Васілеўскага, які быў забіты ў ЗША. Аднак адказу на пытаньне, хто і чаму забіў беларускага хлопца, пакуль няма. Піша **Ірына Чарняўка.**

Нагадаем, што трагічная навіна з амэрыканскага штату Мэн прыйшла 20 чэрвеня. У невялічкім гарадку Ўэлз быў забіты 20-гадовы студэнт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту Аляксей Васілеўскі, які за два дні перад тым прыбыў у Штаты па студэнцкай праграме і ўладкаваўся на працу. Цела хлопца знайшлі раніцай каля інтэрнату, у якім жывуць такія самыя студэнты зь Беларусі, Польшчы, Баўгарыі. Хлопец памёр ад удару нажом у шыю. Праз паўтара тыдня Аляксееў бацька прывёз цела сына з Штатаў і пахаваў у родным Шчучыне.

«За што?! Вось вы мне скажыце, за што можна за два дні забіць дзіця?! Бываюць катастрофы, бываюць здарэньні — там ніхто не вінаваты. Але тут хтосьці мусіць быць пакараны за тое, што майго сына забілі!» — гэтым пытаньнем вось ужо месяц жыве маці Аляксея Яніна Браніславаўна.

## «Гэта быў чалавек будучыні...»

Сапраўды, сьмяротных ворагаў у Штатах Аляксей мець ня мог: зь Беларусі прыляцеў сам, а там пражыў замала, каб пасьпець кагосьці так супраць сябе настроіць. Дый мяркуючы па тым, якую характарыстыку даюць хлопцу людзі, што яго ведалі, у яго ў прынцыпе не магло быць ворагаў. «Добры хлопец, спакойны, яго любілі. Талковы, не задзірысты, выдатна вучыўся, старанна вывучаў ангельскую мову, — кажа Аляксеева былая клясная кіраўніца Таіса Майко».

«Ён паступіў на платнае, а праз год яго перавялі на бюджэт за добрую вучобу. Ён жа атрымоўваў павышаную стыпэндыю, — кажа дзядзька хлопца Анатоль Васілеўскі. — Гэта быў мой любімы пляменьнік: сьціплы, абсалютна бесканфліктны, працавіты, мэтанакіраваны — хлопец, які хоча жыць! Ён так даўно марыў убачыць Амэрыку і паехаў туды зусім не па грошы, з гэтым у сям'і праблем няма. Ён хацеў убачыць сьвет!»

«Я магу сказаць, што Аляксей — гэта чалавек будучыні», — кажа Аляксеева аднакурсьніца.

«Я такога сына страціла — ня ведаю, як мне жыць далей! — плача маці. — Ён такі сын добры, увесь час мне тэлефанаваў». «Мамачка, я буду табе кожны дзень тэлефанаваць, ты не перайма́йся!» — абяцаў ён перад адлётам.

На пытаньне, ці мог Аляксей справакаваць нейкі спантанны канфлікт, які б імгненна перарос у бойку, усе адказваюць катэгарычна: «Не!»

## «Напішу праз дні тры...»

Між тым сьледчыя штату Мэн найбольш імавернай лічаць вэрсію самазабойства. Дзядзька Анатоль Васілеўскі, які разам са сваім братам Рыгорам, Аляксеевым бацькам, лятаў у Штаты па цела пляменьніка, распавёў «НН» пра размову са сьледчым, сэржантам Мэцью Сьцюартам. Той на карысьць вэрсіі самазабойства прывёў два аргумэнты. Па-першае, нож, знойдзены недалёка ад цела, меў адбіткі пальцаў толькі Аляксея і ніякіх іншых. Па-другое, на шыі хлопца была толькі адна рана, сьмяротная, але каля яе — яшчэ некалькі наколаў на скуры. Па вэрсіі сьледчага, такім чынам хлопец прымяраўся, каб дакладна ўдарыць сябе ў сонную артэрыю.

Аднак для сваякоў гэтыя аргумэнты падаюцца зусім непераканаўчымі: «Нож гэты — звычайны кухонны, з кухні інтэрнату. Там павінны былі быць адбіткі сама меней некалькіх дзясяткаў чалавек, а чамусьці засталіся толькі Аляксеевы!» — кажа Анатоль Васілеўскі.

А ў тое, што Аляксей мог прымервацца да ўдару ва ўласную шыю, гэта значыць разважліва рыхтаваў суіцыд, родныя катэгарычна адмаўляюцца верыць.

Дый як паверыць, калі за некалькі гадзінаў да сьмерці Аляксей даслаў родным абсалютна аптымістычны электронны ліст: «Усім вітаньне! Сёньня быў першы працоўны дзень! Працаваў толькі, праўда, 3 гадзіны! З заўтрашняга дня пачынаецца паўнавартасная праца, 10 гадзінаў!.. 5 працоўных дзён на тыдзень! На жаль, ня здолеў пакуль набыць сабе лісапед, безь якога тут практычна як бязь ежы — самы неабходны сродак!.. Учора хадзіў на акіян, проста цудоўна, загараў на сонцы, троху падпаліў скуру — сёньня ўжо нармальна!.. Ня ведаю, калі змагу напісаць наступным разам, хутчэй празь дзянькі 3—4!»

Акрамя гэтага, ёсьць яшчэ шэраг дэталяў, якія падаюцца сваякам нелягічнымі і, зь іхнага пункту гледжаньня, сьведчаць на карысьць вэрсіі аб забойстве.

## «Нам абяцалі паказаць усё...»

Цела Аляксея было знойдзенае наступным ранкам непадалёк ад лесьвіцы на заднім двары невялікага будынку студэнцкага інтэрнату. Гэтыя ўсходы вядуць з задняга двара на супольную кухню першага паверху. Пад лесьвіцай ёсьць закуток, дзе студэнты на ноч пакідаюць свае ровары. Менавіта гэтае месца, самае цёмнае ў двары, — адзінае, якое не асьвятляецца ўначы. І менавіта тут быў забіты Аляксей.

Сьледчы мяркуе, што трагічнае здарэньне адбылося між другой і чацьвёртай гадзінамі ночы. Хлопец пасьля ўдару нажом жыў яшчэ максымум дзьве хвіліны, і ў гэтыя дзьве хвіліны ён поўз да лесьвіцы, здолеў прапаўзьці каля шасьці метраў. У гэты момант яго заўважыла зводдаль беларуска, жыхарка інтэрнату, якая вярталася са спатканьня са сваім хлопцам. Яна пасьля расказала сьледзтву, што бачыла, як паўзе нейкі чалавек, але

падумала, што гэта нейкі п'яны, асаблівай увагі на яго не зьвярнула ды пайшла да сябе. Ніякіх крыкаў перад тым яна таксама, кажа, ня чула. Але родныя хлопца мяркуюць, што дзяўчына ведае больш, чым распавяла.

«Мы былі на гэтым месцы праз тыдзень пасьля Аляксеевай сьмерці, — расказвае Анатоль. — Трава там заставалася ўся прапітаная яго крывёю».

У ноч гібелі Аляксея на студэнцкай кухні была гулянка. Пра гэта сваякі даведаліся не ад сьледзтва — Анатоль разгаварыўся папольску з польскай студэнткай, калі наведваў інтэрнат. Дзяўчына расказала, што жыхарам інтэрнату адміністрацыя вытлумачыла выпадак такім чынам: хлопец наглытаўся наркотыкаў і сам сябе забіў.

Дзядзьку і бацьку не паказалі пакою, дзе два апошнія дні пражыў Аляксей, бібліятэкарка адмовілася пусьціць іх да кампутара, на якім хлопец пісаў свой апошні мэйл.

«Калі мы ляцелі ў Штаты, нам абяцалі паказаць усё, што мы захочам паглядзець, і арганізаваць сустрэчы з усімі, з кім мы захочам паразмаўляць, — расказвае Анатоль. — А на самай справе аказалася так, што нас ад інфармацыі далікатна адсунулі: то сустрэчы не маглі адбыцца, то адбываліся, але ўсе размовы трэба было хутчэй-хутчэй заканчваць».

## «Мы баяліся, што нам не аддадуць цела...»

Але найбольш змучылі сваякоў праблемы з вывазам цела. «Мы вырашылі ні на чым не настойваць, нічога не дамагацца, бо баяліся, што нам увогуле не дадуць вывезьці Аляксея», — кажа Анатоль Васілеўскі.

Паездку Аляксея Васілеўскага, а пасьля і візыт сваякоў па яго цела арганізоўвала менская фірма «Star Travel». У Штатах прымаючай арганізацыяй для беларускіх студэнтаў была кампанія CIEE («Council on International Educational Exchange»), гэтая ж фірма ўзяла на сябе клопат пра сваякоў і кампэнсавала затраты на перавозку цела, што не былі прадугледжаныя страхоўкай Аляксея. Перакладчыца CIEE увесь час суправаджала дзядзьку і бацьку хлопца, першы дзень, пакуль не запячаталі труну, зь імі быў таксама прадстаўнік беларускага консульства ў Вашынгтоне Віктар Чараховіч.

Вылецець у Менск планавалі ў сераду, але раптам ад перакладчыцы даведаліся, што «Люфтганза» ня хоча везьці на борце труну. Пазьней CIEE паведаміла, што дамовілася зь «Люфтганзай» на вылет у чацьвер, але тут тэлефануе В.Чараховіч і кажа, што вывезьці труну можна будзе толькі ў нядзелю. У чацьвер, калі ўжо стаялі на рэгістрацыі, перакладчыца зноў паведаміла, што ёсьць праблемы. «Мажліва, што ўсё сапраўды так і было, як яны казалі, і тут толькі нейкая няўзгодненасць атрымалася, але выглядала на тое, быццам CIEE была зацікаўлена ў тым, каб мы ня надта цікавіліся акалічнасьцямі гібелі, а беларускае консульства — тым, каб мы, змучаныя ўсім гэтым, распачалі міжнародны скандал», — кажа Анатоль.

## «Мы хочам ведаць — за што...»

Віктар Чараховіч паведаміў нам, што беларускае дыпляматычнае ведамства даслала спэцыяльную ноту на адрас дзярждэпартамэнту ЗША з просьбай, каб сьледзтва было праведзена як мага дакладней і апэратыўней.

БТ яшчэ да пахаваньня хлопца выдала сюжэт, у якім было заяўлена, што Аляксей Васілеўскі меў праблемы з вучобай, таму і зьехаў у Злучаныя Штаты, «паддаўшыся на абяцанкі лягчэйшага жыцьця».

«Яшчэ там, у Штатах, мы з бацькам Аляксея вырашылі, што калі іх мэта — скандал, то мы гэтага скандалу падняць не дамо, — кажа Анатоль Васілеўскі. — Мы проста хочам ведаць — як і за што яго забілі!»

**P.S.** У БНТУ, асабліва на факультэце маркетынгу, мэнэджмэнту і прадпрымальніцтва, дзе на трэцім курсе вучыўся Аляксей, студэнтаў, што таксама зьехалі ў Амэрыку на лета, плянуюць выгнаць з вучобы. Юрыдычная падстава — пропуск вытворчай практыкі. Як расказаў «Нашай Ніве» намесьнік дэкана факультэту Андрэй Рахлей, такая норма існуе даўно, але раней «дапускаліся розныя вольнасьці». Пасьля трагічнага здарэньня адміністрацыя факультэту будзе дзейнічаць згодна з правіламі вышэйшай школы: «Хто своечасова ня здасьць практыку без паважнай прычыны, будзе выключаны», — кажа намесьнік дэкана.



**Аляксей Васілеўскі быў выдатнікам, але БТ заявіла, што ён меў праблемы з вучобай.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Я Чавэса бачыў

Уга Чавэс усё ж прыехаў у Беларусь. Хай візыт атрымаўся і не зусім такі, якім чакалі. У панядзелак 24-га заманілася мне паглядзець на лацінаамэрыканскага дыктатара і аднагодка беларускага прэзыдэнта — ня так часта ў Беларусь прыяжджаюць кіраўнікі не эсэндэўскіх дзяржаваў. А пра Чавэса ж яшчэ гавораць, што ў параўнаньні зь ім Лукашэнка выглядае сапраўдным амэрыканафілам.

Адзінай для шараговага чалавека магчымасьцю ўбачыць высокага госьця было ўскладаньне кветак на плошчы Перамогі. Плянавалася, што вэнэсуэльскі лідэр зьявіцца там у 13.40. Я й прыйшоў туды ў адпаведны час.

У падземным пераходзе ўжо дзяжурылі прывезеныя аўтобусамі БРСМаўцы, ганаровая варта й прэзыдэнцкі аркестар. У кожнага, хто меўся ўбачыць Чавэса, да адзеньня мусіла быць прышпілена чырвона-зялёная стужка.

Час ішоў, а Чавэс усё не зьяўляўся. Некаторыя цішком пачалі выказваць крамольнае меркаваньне: можа, зусім не прыедзе? Усе нэрваваліся.

Рослыя хлопцы з Акадэміі фізычнага выхаваньня пыталіся адзін аднаго: а дзе тая Вэнэсуэла? Гэта ў Ціхім акіяне? Змучаны музыка з аркестру наракаў, што ад стомы ня ў стане ні сядзець, ні стаяць, ні ляжаць. Сьпёка (30 паводле Цэльсія) і смага сапраўды былі знакамітыя.

Неўзабаве гледачоў пачалі выпускаць на пляц. Мне ўдалося ўплюшчыцца ў шэрагі лукамольцаў і прайсьці на плошчу. (Я быў, напэўна, адзіным бяз той чырвона-зялёнай стужачкі.) Прысутным раздалі беларускія і вэнэсуэльскія сьцягі (я ўзяў вэнэсуэльскі), каб імі вітаць прэзыдэнта баліварыянскай краіны.

І калі ў пераходзе было яшчэ не бяды, то на сонцы стаяць было папросту немагчыма.

Нейкаму пільнаму гэбісту не спадабалася саколка на маім суседзе з выявай амэрыканскага сьцяга: «Ты ў першыя шэрагі ня лезь, а то і зусім сыдзі з плошчы», — ласкава параіў ён. Студэнты, пакутуючы ад сквару, спрабавалі пацiху зьбегчы з сустрэчы, але іхнія выкладчыкі ў самым зародку перарывалі гэтыя несур'ёзныя намеры. Тым больш дзіўным выглядала тое, як на пляц нейкім чынам змаглі прарвацца два альканаўты з Заводзкага раёну. «Што вы тут робіце?» — было запытаньне ахоўнікаў. «На Чавэса прыйшлі паглядзець». — «Валіце адсюль, пакуль не атрымалі, гэта ж закрытае мерапрыемства».

Прайшлі ўжо дзьве гадзіна, а Чавэса ўсё няма. Сонца настолькі моцна нагрэла ў галаву аднаму сталаму мужчыну, што ён страціў прытомнасьць проста на прыступках пераходу. Усё б нічога, але праз пару хвіляў якраз павінен быў зьявіцца непараўнальны Уга. У аўральным рэжыме была выклікана хуткая дапамога, і ўжо праз пару імгненьняў дзядуля быў унутры машыны. Пасьпелі — Чавэса яшчэ не было. Чамусьці мне здаецца, што пра гэты выпадак не згадае ніводзін дзяржаўны рэпарцёр.

Вэнэсуэлец зьявіўся на плошчы ў суправаджэньні Віктара Шэймана ў той момант, калі гадзіньнік паказваў 16.00, а цярпеньне людзей было на мяжы. Чавэс адразу пачаў дасылаць тым, хто яго сустракаў, паветраныя пацалункі і бясконца прыкладаў руку да сэрца, паказваючы, што вельмі любіць нас. Ён зьзяў асьляпляльнай усьмешкай.

Яшчэ некалькі хвілін — і вэнэсуэлец ужо ўсклаў да манумэнту кветкі і пайшоў у народ. Чавэс доўга расказваў пра тое, як ён любіць дзяцей і моладзь, пра тое, што запрашае маладых беларусаў наведаць яго краіну. Уга дзяліўся плянамі, як ён скора пабудуе новы сьвет, дзе ня будзе бедных. Ня мог Чавэс не згадаць і пра свайго найлепшага хаўрусьніка — Кастра: ён паведаміў, што хоць Фідэлю хутка ўжо будзе восемдзесят, але ў душы ён застаецца ранейшым хлапчуком.

Чавэс ідэальна адчувае сябе ў слове, ён бы мог гаварыць яшчэ гадзінамі, але яго няспынна ціснуў час. Яшчэ перад сыходам ён пасьпеў паціснуць рукі і паабдымацца з вэтэранамі, а таксама заклікаў усіх пачаць змагацца з сусьветным імпэрыялізмам.

Не пасьпеў Чавэс сесьці ў машыну, як некаторыя навучэнцы ўжо далі лататы з пляцу, а Уга на разьвітаньне працягваў махаць сваёй магутнай рукой.

**Зьміцер Панкавец**

# Краты італьянскія і беларускія

У Беларусі можа разгарэцца футбольны скандал, падобны да італьянскага. Піша **Зьміцер Панкавец.**

Галоўная футбольная навіна лета — не перамога зборнай Італіі на мундыялі, а буйны карупцыйны скандал на Апэнінах. У скандале аказаліся замяшаныя адразу чатыры клюбы сэрыі «А»: «Ювэнтус», «Мілян», «Ляцыё» і «Фіярэнціна».

Праслухоўваньне тэлефонных размоў высьветліла, што гендырэктар «Ювэнтусу» Лючана Моджы меў магчымасьць уплываць на прызначэньне арбітраў на матчы італьянскага чэмпіянату. Усяго налічылі 19 такіх паядынкаў. 12 зь іх зьвязаныя са «Старой сыньёрай». Як вынік, «Ювэ» і пацярпеў найбольш — турынскі клюб адпраўляецца ў сэрыю «В». Але ня гэта найгоршае для яго заўзятараў. Клюб будзе мець на старце чэмпіянату мінус 17 пунктаў. Мусілі разьвітацца з элітай «Ляцыё» і «Фіярэнціна», але апэляцыйны суд 25 ліпеня пашкадаваў рымскі і флярэнтыйскі клюбы. Яны застаюцца ў эліце. «Ляцыё» будзе мець на старце мінус 11 пунктаў, «Фіярэнціна» — мінус 19. «Мілян» — мінус восем пунктаў.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Рэдактар «Прессбола» зьвярнуў увагу на дзіўныя пройгрышы беларусаў чэхам і малдаванам.**

Гледзячы на Італію, згадваецца, як пару гадоў назад спартовая газэта «Прессбол» выйшла з сэнсацыйным артыкулам «Апэрацыя "Крот"», у якім расказвалася пра дагаворныя матчы ў чэмпіянаце Беларусі, а таксама гульні нацыянальнай зборнай. Аўтары публікацыі галоўны рэдактар Уладзімір Беражкоў **(на фота)** і журналіст Юры Доўнар пісалі, што зборная Беларусі прайграла два дзіўныя матчы восеньню 2004 году малдаванам і чэхам. Пракуратура нават распачала крымінальную справу паводле зьвестак газэты.

Ці магчымы падобны да італьянскага суд у Беларусі? Спартовы журналіст Сяргей Аляхновіч кажа, што ў імавернасьць такога працэсу верыцца з цяжкасьцю. «Але вельмі хацелася б, каб гэта здарылася. Літаральна пару дзён таму вярнуўся з Польшчы, там таксама нібыта арыштавалі некалькі футбольных судзьдзяў. Не хацелася б, каб Беларусь адставала ад сваіх суседзяў. Тым больш што Беражкоў зрабіў усё, што ад яго залежала як ад журналіста. Цяпер ужо справа за праваахоўнымі органамі».

Сам сп.Беражкоў настроены больш аптымістычна. Ён упэўнены, што падобны працэс у Беларусі можа пачацца ў найбліжэйшы час: «З дагаворнымі матчамі сытуацыя такая, як некалі ў СССР з сэксам: іх у нас нібыта няма, але ж такія матчы былі, ёсьць і будуць, калі зараз не разабрацца з гэтай праблемай. Галоўнае цяпер — разабрацца ў сытуацыі і пакараць вінаватых. І я думаю, што такое адбудзецца, тым болей Італія зь Нямеччынай падаравалі нам цудоўны прэцэдэнт. Пакуль што «Прессбол» ня мае магчымасьці пісаць пра справу «кратоў», бо мы ня можам парушаць тайну сьледзтва, але, калі зьявіцца юрыдычная магчымасьць, чакайце новых матэрыялаў. Я думаю, што здаровы сэнс урэшце пераможа і суд пачнецца».

Пытаньне дагаворных матчаў становіцца галоўнай праблемай сучаснага футболу. То ў адной, то ў другой краіне становяцца вядомымі факты карупцыі на футбольных арэнах. Асабліва шкада заўзятараў, якія часам нават і не падазраюць што зьяўляюцца сьведкамі ўсяго толькі добра сплянаванага спэктаклю, а не сапраўдных спартовых жарсьцяў. Зло павінна быць пакаранае.

# Танец з шаблямі



Лукашэнка падарыў Чавэсу шаблю, а той сказаў, што абедзьве краіны мусяць трымаць руку на клінку. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Палітыкі часта акторствуюць, але гэтыя перамовы ператварыліся ў шчырае братаньне. Два прэзыдэнты-аднагодкі, такія не падобныя з выгляду, часам падаваліся блізьнятамі. Ці даўно Лукашэнка заяўляў, што Ленін і Сталін — сымбалі нашага народу? Чавэс, ледзьве сышоўшы з трапа, пахваліў, што ў Беларусі сталі яваю ленінскія запаветы, і наведаў «Лінію Сталіна».

Госьць прыляцеў з далёкага мэрыдыяну, але якія блізкія паралелі! Былы афіцэр Чавэс прыйшоў да ўлады пад лёзунгам змаганьня з карупцыяй. Зладзіў пару рэфэрэндумаў, замяніў апазыцыйны парлямэнт кішэнным, перапісаў канстытуцыю і стаў душыць палітычныя пратэсты. Ён — аматар прастамоўнай рыторыкі, вайсковых гульняў і спорту.

Два кіраўнікі ідэальна сышліся на глебе антыпатыі да сусьветнага гегемона, «псэўдаэканамічных рэформаў» ды «каляровых рэвалюцыяў». Цяпер Беларусь з Вэнэсуэлай, як засьведчана ў адмысловым мэмарандуме, — стратэгічныя партнэры. Зрэшты, зазначае палітоляг Валер Карбалевіч, Лукашэнку заўжды ставала абачлівасьці, каб не загуляцца з агнём. Так было ў стасунках з Садамам, Мілошавічам, цяпер — з Ахмадынэжадам. Наўрад ці дарэчы беларускаму прэзыдэнту і ляўры сузаснавальніка антыамэрыканскага інтэрнацыяналу, аўтарскі праект якога Чавэс не без дасьціпнасьці называе «восьсю дабра». Вэнэсуэльца тут не пераплюнеш, а поўхаў на міжнароднай арэне Менску і так стае.

Застаецца піяр-навар для свайго электарату. Дзяржаўныя мэдыі вылузваюцца са скуры, ствараючы ілюзію кіпучых міжнародных стасункаў. Глядзеце, аж зь іншай паловы зямной кулі да нас такія зухі пілуюць!

Натуральна, маўчок пра тое, чаму не зазіраюць суседзі — дзяржаўныя лідэры зь Вільні, Рыгі, Варшавы... Чаму афіцыйны Менск ня можа палітычна паразумецца з Эўропай, куды прадае ўжо болей за палову свайго экспартнага тавару.

З Вэнэсуэлай жа тавараварот сёлета складае 6 тысячаў даляраў: за акіянам купленыя некалькі запчастак ды скрынка экзатычнай садавіны. Незалежныя экспэрты скептычна глядзяць на пэрспэктывы прарыву ў эканамічных стасунках. У сусьветнага рынку свае законы, палітычная пуга тут мала дапамагае.

Што да імавернага збройнага бізнэсу, то тут нас пэўна ж заткне за пояс Расея. Чавэс зь цікавасьцю агледзеў беларускі арсэнал, аднак задаволіўся падоранай калекцыйнай шабляй. А мільярд даляраў павёз у Маскву — наважыўся прыдбаць для сваіх сокалаў партыю «Су-30».

**Акцыя салідарнасьці зь Дзянісам Дзянісавым, актывістам, зь якім зьвязвалі стварэньне ру «Бунт». Менск, 25 ліпеня. У Інтэрнэце зьявілася інфармацыя, што 22 ліпеня Дз.Дзянісава невядомыя і вывезьлі за межы Менску. Ужо некалькі дзён нічога невядома, дзе ён ёсьць. ўрэзцы: Дзяніс Дзянісаў.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Сёньня ў яго стае на гэта нафтадаляраў (сьцішана гавораць і пра какаінавы транзыт). Але як толькі цэны на «чорнае золата» пахіснуцца, вэнэсуэльская мадэль лясьнецца, зазначаюць эканамісты. І тут вялікае падабенства зь «беларускай мадэллю», што ліпіць на танным газе ды — во дзіва! — таксама нафтавай рэнце.

Ачмурэлыя ад папулізму народы рана ці позна мусяць расплачвацца. Пэруанскі пісьменьнік Марыё Варгас Льёса напісаў пра Чавэсаву Вэнэсуэлу артыкул «Самазабойства аднае нацыі».

Загаловак працінае токам, бо да яго цалкам дапасуецца і пэсымістычны сцэнар для Беларусі. Дзякуй богу, гэта не адзіны сцэнар.

ухху
зьбілі
На





PHOTOBYMEDIANET



# Запіскі аб Сьцяпану Кірыешку



Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

У Холмса быў Ватсан, у Эркюля Пуаро — Гастынгс, у Ніра Вульфа — Арчы Гудвін і толькі вялікі сышчык Сьцяпан Су...(дзеля канспірацыі назавём яго Кірыешка) застаўся без партнэра і летапісца сваіх подзьвігаў. Цяпер, калі справа «Партнэрства» дайшла да суду, так болей заставацца ня можа. Прапаную сваю сьціплую кандыдатуру.

…У той незабыўны лютаўскі вечар у нашай маленькай кватэры панаваў хаос. Бліскучы мозг Сьцяпана вырашаў загадку — колькі пацукоў спатрэбіцца грузінскім тэрарыстам раскласьці ў вёдрах і давесьці да стану атрутнай масы, каб хапіла вырубіць усіх мужчынаў са спэцыяльнасьцю муляра чацьвёртага разраду ў Фрунзэнскім раёне.

Пацукі не жадалі разлагацца і бегалі па пакоі, пажыраючы Сьцяпанавы граматы ды шматлікія партрэты Дзяржынскага.

Раптам на прыступках пачуліся нейкія крокі: гэта быў кліент.

Кліент аказаўся рослым мужыком прыблізна пяцідзесяці двух гадоў, з лысінай, якую ён акуратна зачэсваў, і шклянымі вачамі, у якіх быў адлюстраваны жах.

Ня проста жах, а супэр-гіпэр-жах!

— Я дыктатар адной усходнеэўрапейскай краіны, — пачаў госьць. — На насу выбары, перад якімі я зазвычай проста ўсіх запалохваю... Але вось днямі я па прыколе прачытаў Канстытуцыю і знайшоў гэта: «Падрыхтоўка і правядзеньне выбараў адбываюцца адкрыта і галосна». А што калі гэта па прыколе прачытаюць і мае ворагі? Цяпер вы разумееце, Сьцяпане, чаму я крычу па начах? Чаму падчас апошняга рэфэрэндуму я не падкарэктваў гэты артыкул?! Чаму?..

— Спакойна, — Кірыешка заўсёды ведаў выйсьце. — Мы павінны хуценька ўнесьці папраўкі ў Крымінальны кодэкс аб забароне дзейнасьці ўсяго незарэгістраванага, і тады Вы лёгка перасадзіце ўсіх вашых апанэнтаў.

— Праўда? — Госьць паглядзеў на сышчыка з надзеяй.

Мы са Сьцяпанам паехалі ўносіць папраўкі. Аднак не пасьпелі мы разгарнуць кодэкс, як я адчуў на сваёй шыі холад рэвальвэра.

— Стаяць. А зараз павольна павярнуцца.

Перад намі былі тры хлопцы і дзяўчынка.

— Вітаньне ад National Democratic Institute, — сказаў адзін з хлопцаў і выстраліў сышчыку ў сэрца.

Але той нават не зварухнуўся.

Шакаваныя актывісты, пакідаўшы рэвальвэры і мабільнікі зь літоўскімі нумарамі, зьбеглі.

Я ня верыў вачам:

— Што здарылася, Кірыешка?

Ён пасьміхнуўся: — Яны забыліся, што ў мяне, як чэкіста, чыстыя рукі, халодная галава і гарачае сэрца: кулі ў ім проста плавяцца. Вось калі б яны пальнулі мне ў лёгкае або пахвіну...

Мы зрабілі сваю справу з папраўкамі.

Кліент быў проста шчасьлівы. У знак падзякі ён нават паабяцаў Кірыешку грамату, аднак той адмовіўся. Ён ніколі ня браў граматаў ад жанчын і выпускнікоў Магілёўскага пэдуну.

А ў нашай маленькай кватэры зноў настала нудота. Вялікі сышчык працягваў ставіць досьледы на пацуках і гуляў з маўзэрам Дзяржынскага, напаўняючы пакой чароўнымі гукамі «піф» і «паф».

# Загнулі цану, а цяпер расплачваемся

Беларусь будзе пастаўляць угнаеньні ў Кітай «на ўзаемапрымальных умовах», заявіў віцэ-прэм'ер.

Беларуская калійная кампанія (БКК) заключыла кантракт з Кітаем — адным з галоўным імпарцёраў нашай сыравіны. Выступаючы ў аўторак перад беларускімі дыпляматамі, першы намесьнік прэм'ер-міністра Ўладзімер Сямашка заявіў, што дакумэнт падпісаны «на ўзаемапрымальных умовах», а заплянаваныя аб'ёмы экспарту ўгнаеньняў па выніках году будуць выкананыя. Аднак гэтыя сьцьверджаньні віцэ-прэм'ера выклікаюць сумневы. Згодна з новым кантрактам, аб'ём прададзенай у Кітай прадукцыі складзе 1,7 млн тон угнаеньняў, што меней, чым у 2005 г., калі было прададзена 2 млн тон.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Салігорскія руднікі зноў працуюць на поўную моц.

Што да цаны, то віцэ-прэм'ер яе не назваў. Адмаўляецца ад камэнтароў і БКК. Інтэрнэт-газэта «Салідарнасць» мае зьвесткі, што прадстаўнікі Кітаю сышліся на цане 190 даляраў за тону. Шмат гэта ці мала? Адказаць на гэтае пытаньне няпроста, піша gazetaby.com. Справа ў тым, што гандаль угнаеньнямі, як і многія іншыя сфэры дзейнасьці ў нашай дзяржаве, цяжка назваць празрыстым. Адны крыніцы сьцьвярджаюць, што летась Беларусь аддавала прадукцыю па 165 даляраў за тону, а на пачатку перамоваў мэнэджэры БКК разьлічвалі падняць цана да 205. Другія кажуць, што раней прадавалі па 210, а хацелі — па 240—245 даляраў за тону.

Летась месячныя пастаўкі складалі каля 650 тысяч тон. Апошнія ж некалькі месяцаў гэтага году «Беларуськалій» прадаваў толькі пад 300 тысяч тон угнаеньняў за месяц. У выніку краіна можа недаатрымаць валюту. Летась даход ад продажу калійных угнаеньняў склаў каля мільярда даляраў.

**МБ**

## 28 ліпеня суд над «Партнэрствам»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

28 ліпеня ў судзе Цэнтральнага раёну Менску распачнецца працэс над актывістамі незарэгістраванай грамадзкай ініцыятывы «Партнэрства», якія мелі намер весьці незалежнае назіраньне за выбарамі прэзыдэнта. Мікалая Астрэйку, Цімоха Дранчука, Эніру Браніцкую і Алеся Шалайку вінавацяць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі (арт.193 ч.2 Крымінальнага кодэксу). Працэс будзе закрытым, пра што паведаміў судзьдзя Леанід Ясіновіч, які будзе яго весьці.

21 лютага чатырох актывістаў арыштавалі супрацоўнікі КДБ. Ім закідаюць падрыхтоўку масавых беспарадкаў шляхам абвяшчэньня нібыта загадзя падрыхтаваных вынікаў экзыт-полаў. Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся напярэдадні працэсу са сваякамі арыштаваных, а таксама з эўрапейскімі дыпляматамі, якіх заклікаў зрабіць усё для вызваленьня юнакоў. Ён лічыць іх палітычнымі вязьнямі.

**Сямён Печанко**

## Дзень незалежнасьці ў Берасьці дазволілі й забаранілі

27 ліпеня ў Берасьці на стадыёне «Будаўнік» меўся адбыцца мітынг «За свабоду! За незалежнасьць!», прысьвечаны 16-й гадавіне прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. «Сёньняшні рэжым прадае незалежнасьць краіны за танны газ. Хаваючыся за гучнымі фразамі аб захаваньні сувэрэнітэту, улада думае толькі пра тое, каб захавацца самой», — так арганізатары мерапрыемства вызначаюць галоўную думку мітынгу.

На мітынг зьбіраўся прыехаць Аляксандар Мілінкевіч. У гэты дзень ён меў намер таксама наведаць уладальнікаў маршрутных таксовак, якія трымаюць галадоўку.

Але, мусіць, у апошнім момант лібэралам у берасьцейскай адміністрацыі далі па шапцы, і яны адклікалі ўласнай рукой выдадзены дазвол.

**МБ**

## Дрэваапрацоўка будзе нацыяналізаваная

На апошняй нарадзе Саўміну прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі заявіў, што «малаэфэктыўныя прыватныя прадпрыемствы дрэваапрацоўчага комплексу будуць нацыяналізаваныя». У «Беллеспаперапраме» адмаўляюцца гаварыць, які адсотак прадпрыемстваў працуе малаэфэктыўна, бо, як зазначылі там, не існуе такога крытэру, які б вызначаў гэтую малаэфэктыўнасьць. А.Лукашэнка ж у сваю чаргу сказаў, што калі ў галіне дрэваапрацоўкі ня будзе наведзены парадак, то міністар Пётар Сямашка можа апынуцца на лаве падсудных.

Парадак можа заключацца ў тым, што прыбытковая галіна цалкам пяройдзе пад кантроль Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, якое ўжо актыўна дзейнічае ў гэтай сфэры.

**Зьміцер Панкавец**

# Помнік Багдановічу
## не зьнясуць, дык упрыгожаць

У рэдакцыю «НН» зьвярнуліся чытачы-менчукі, занепакоеныя сюжэтам пра рамонт Опэрнага тэатру, паказаным на тэлеканале СТВ. Зь сюжэту вынікала, што перад Опэрай на цэнтральнай алеі зьявіцца фантан. Скульптар Генадзь Буралкін настойваў, што найлепшым упрыгожаньнем парку маюць стаць скульптуры Апалёна і Пана, якія спрачаюцца міжсобку. Помніка паэту на праекце, паказаным у сюжэце, не было... «Не дапусьцім зносу!» — перажывалі людзі.

Тэатар сапраўды зьменіць сваё аблічча. Кажуць, што яму нададуць рысы, якія задумваў аўтар — архітэктар Іосіф Лангбард. Зьнікне купал над будынкам, у порціках паўстануць скульптуры чатырох музаў.

Аднак галоўны ахітэктар інстытуту «Белпраект» Анатоль Шаболін адназначна заявіў: «Помнік Максіму Багдановічу застаецца». «Белпраект» распрацоўваў праект упарадкаваньня сквэру перад тэатрам, але рашэньня пра знос Багдановічавага помніку не прымалася.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ці спалучацца Опэра і Багдановіч з Панам?**

Застаецца толькі пытаньне, наколькі канструктывісцкая Опэра і сумна-задуменны Багдановіч будуць спалучацца са спрэчкаю Апалёна і Пана.

**АВ**

# Кніга пра нашу беларускую праўду

Выйшла з друку кніга Сяргея Навумчыка «Сем гадоў адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995)», якая распавядае пра каляпс Савецкага Саюзу і першыя гады беларускай незалежнасьці. Гэта кніга пра тое, як Беларусь у пачатку 1990-х мела шанец пайсьці эўрапейскім шляхам і як падзеі 1994—1995 гадоў паставілі на гэтым шанцы крыж. Чацьвёртая хваля беларускага адраджэньня пачалася ў 1988 годзе стварэньнем БНФ і скончылася ганебным рэфэрэндумам 1995 г.

Аўтар дэталёва апісвае гісторыю Народнага фронту — першага пасьля савецкіх часоў грамадзкага руху, які пачаўся ініцыятывай зьнізу, — і дзейнасьць фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, унікальны пэрыяд, калі голас беларусаў гучаў з парлямэнцкай трыбуны. С.Навумчык палемізуе зь сёньняшнім кіраўніцтвам краіны, якое ў змрочных фарбах падае заранак беларускай незалежнасьці. «У кнізе Сяргея Навумчыка адлюстравана наша рацыя, наша беларуская праўда і наша змаганьне», — напісаў у прадмове да кнігі Зянон Пазьняк.

Замовіць кнігу можна ў незалежных распаўсюднікаў.



**Навумчык Сяргей. Сем гадоў адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995).** Варшава—Прага, 2006. — 140 с. Наклад 1000 асобнікаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Мілінкевічу споўнілася 59

25 ліпеня лідэр беларускіх дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч адсьвяткаваў дзень народзінаў. Яму споўнілася 59.

Першай Аляксандра Ўладзімеравіча павіншавала жонка — падрыхтавала мужу сьвяточны сьняданак пры сьвечках. «Гэтак ціха ўсё прыгатавала, пакуль я спаў, урыгожыла пакой балёнікамі», — зь цеплынёй у голасе кажа сп. Аляксандар. Адзначаць народзіны Мілінкевіч будзе тройчы: у аўторак у Менску ў вузкім коле блізкіх людзей, у выходныя на Гарадзеншчыне, а ў панядзелак ён з жонкай выправіцца ў Варшаву, каб адсьвяткаваць разам з сынамі, якія там вучацца.

**СП**

# 28-гадовы ксёндз загінуў у аўтакатастрофе


Генрых Дамашка (у цэнтры) працаваў на Глыбоччыне.

21 ліпеня загінуў адміністратар парафіі ў в.Дзеркаўшчына на Глыбоччыне Генрых Дамашка. Ён вяртаўся дадому з могілак і на вялікай хуткасьці ўрэзаўся ў слуп. Машына літаральна раскалолася надвое.

«Гэта быў спакойны, поўны дабрыні чалавек. Малады, рухавы, ён увесь час усьміхаўся», — кажа пробашч касьцёлу ў Глыбокім а.Кшыштаф Мікалайчык. «Ён пры касьцёле ў Дзеркаўшчыне футбольную каманду стварыў, дзяцей вельмі любіў. Людзі былі ім здаволеныя, і я радаваўся, гледзячы на працу Генрыха».

Генрых Дамашка нарадзіўся 11 верасьня 1977 г. у Літве. 15 верасьня 2001 г. у Росіцы высьвячаны ў сьвятара. У Дзеркаўшчыне працаваў са сьнежня 2005 г., зьяўляўся натарыюсам біскупскага суду. Да гэтага сьвятарстваваў у Лепелі.

Пахавалі кс.Дамашку 24 ліпеня ў Відзах на Браслаўшчыне, дзе жыве ягоная маці. «Ня ведаю, як яна перанясе такое гора, — кажа былы сакурсьнік а.Генрыха па Гарадзенскай сэмінарыі Пётра Рудкоўскі. — Памятаю, што падчас вучобы ён ледзь не штодня тэлефанаваў маці — яна вельмі хвалявалася за сына».

**Зьміцер Панкавец**

# Кнігі Катлярчука не патрэбныя на радзіме

Беларускі гісторык са Швэцыі Андрэй Катлярчук нядаўна выдаў па-ангельску кнігу «Ў цені Польшчы і Расеі. ВКЛ і Швэцыя падчас эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.», якая, у тым ліку, распавядае пра Кейданскую унію 1655 г. між ВКЛ і Швэцыяй. У Стакгольмскім унівэрсытэце сп.Катлярчук абараніў па кнізе доктарскую, апанэнтам на абароне выступаў прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту Робэр Фрост.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Андрэй Катлярчук расчараваны стаўленьнем беларускіх бібліятэк.

Потым аўтар вырашыў бясплатна даслаць асобнікі кнігі галоўным беларускім бібліятэкам. Гэта ён зрабіў 10 чэрвеня, даслаўшы кнігі па ўнівэрсытэцкай прыярытэтнай пошце заказным лістом — такім чынам адпраўленьні мусілі дайсьці акурат у рукі адрасата. І ён моцна зьдзівіўся, калі напрыканцы чэрвеня атрымаў назад пяць асобнікаў кнігі зь бібліятэк унівэрсытэтаў Берасьця, Горадні і Полацку, біблітэкі БДПУ імя М. Танка і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук. Пасылкі ў Швэцыю вярнуліся ў жудасным стане: усе пакамечаныя і падраныя. На ўсіх іх было напісана: «За адмовай». Іншыя бібліятэкі кнігаў не вярталі.

Навуковы супрацоўнік аддзелу міжнароднай сувязі Нацыянальнай акадэміі навук Вольга Чыкун кажа: «Кніга такая сапраўды да нас прыходзіла, але трэба былі немалыя грошы на мытныя зборы, ПДВ, дэклярацыі. У Акадэміі, на жаль, такіх грошай няма, і мы вымушаны былі адмовіцца ад кнігі сп.Катлярчука. Гэта ўжо ня першы такі выпадак. Часам мы нават накіроўваем адпраўнікам афіцыйныя прабачэньні з тае прычыны, што ня можам забраць кнігі».

Супрацоўнік аддзелу міжнароднага супрацоўніцтва БДПУ імя М.Танка Валеры Мацюк кажа, што не існавала ніякага мэханізму атрыманьня кнігі, бо не прыйшло адпаведных дакумэнтаў. «Мы проста не ведалі, да каго зьвяртацца, — кажа Мацюк. — Пытаньне ня ў грашах, там максымум эўра 2—4 заплаціць трэба было. Мы з радасьцю прымаем у бібліятэку кнігі, але проста не было магчымасьці атрымаць».

У Гарадзенскім унівэрсытэце сказалі, што да іх прыйшло пісьмовае паведамленьне аб тым, што кніга знаходзіцца на мытні і трэба аформіць адпаведныя дакумэнты. Ва ўнівэрсытэце палічылі за лепшае не займацца маруднай папяровай працай і плаціць грошы, а адпісалі «за адмовай».

Прыкра, што бібліятэкі ня маюць ні часу, ні грошай, каб аформіць ва ўласны збор кнігі. Ці захоча толькі Андрэй наступным разам дасылаць свае працы ў Беларусь?

**ЗП**



# Шатэрнік і краскі

У арт-кавярні «Добрыя мысьлі» разгарнулася выстава Алеся Шатэрніка «Беларусь Сьвятая». Нягледзячы на прэтэнцыёзны назоў, гэта вельмі яркая, лёгкая й сьветлая экспазыцыя. Тыя, хто ведае даробак Шатэрніка як грунтоўнага майстра-скульптара, будуць шчыра зьдзіўленыя амаль бязважкай, празрыстай часткай ягонае творчасьці.

Таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім. Мы ведаем Шатэрніка-паэта, Шатэрніка-публіцыста, Шатэрніка — грамадзкага дзеяча. Цяпер, высьветлілася, ён яшчэ й жывапісец. Апошняе дзесяцігодзьдзе майстар нястомна экспэрымэнтуе ў гэтым жанры. Яго можна ўбачыць і з эцюднікам у палях вакол Блакітных азёраў, і за варштатам у ягонай майстэрні. Лёгкія жывапісныя імпрэсіі мастака вяртаюць нам першародны сэнс мастацтва — проста распавесьці пра сьвет наш уласнымі сродкамі. І сьвет Шатэрніка захапляе сваё непасрэднасьцю, шчырасьцю й нязмушанасьцю. Без настаўленьняў, маніфэстаў і патэтыкі.

Хоць без патэтыкі не абышлося. Выставу «Беларусь Сьвятая» адкрывае вялікае палатно «Ўсяслаў Полацкі», на якім князь-чарадзей прадстаўлены вершнікам-волатам між блакітных даляглядаў, у смузе якіх лунаюць бел-чырвона-белыя сьцягі. Вось тут і згадваеш, што маэстра перадусім скульптар. І конны партрэт легендарнага князя выглядае найперш як жывапісны эскіз таго самага славутага ўжо помніка, што Алесь Шатэрнік прапануе Полацку. І ў гэткім выкананьні вобраз полацкага князя глядзіцца ня горш.

Мастак лёгка й нязмушана піша інтэр’еры сьвятыняў, ненатужна выпісваючы няпростыя пэрспэктывы архітэктурных дэталяў. Досьвед адмыслоўца-інтэр’ершчыка тут надаецца яму як найлепей.

Таксама на выставе прадстаўлены тузін разнаітых краявідаў, кожны зь якіх ёсьць часьцінаю аўтарскае біяграфіі, пра што Шатэрнік можа распавядаць ва ўласьцівай яму захапляльнай манеры. І гэтае захапленьне міжволі перадаецца гледачу. Але захапленьне, бадай, не ад прыватных расповедаў, а ад чысьціні звонкіх фарбаў, якімі апэруе мастак. На палотнах перад намі паўстае ягоная Беларусь. Напрадвесьні і ў шыкоўным восеньскім буцьвеньні, у смузе адлілжнай шарай гадзіны і ў пярэстым зіхаценьні мільёнаў нашых красак.

**СХ**

**Выставу можна ўбачыць па адрасе: кавярня «Фальварак “Добрыя мысьлі”» (Магілёўская, 12). Праезд да ст. м. «Інстытут культуры».**

## КАЛЯНДАР

## Жнівень

**5** — 500 гадоў (1506) з часу Клецкай бітвы паміж войскам ВКЛ на чале зь Міхалам Глінскім і войскам крымскіх татар. Першая вялікая перамога над крымскімі татарамі.

**11** — 150 гадоў з дня нараджэньня этнографа Ўладзімера Дабравольскага (1856—1920), які дасьледаваў жыцьцё беларусаў Смаленшчыны, уклаў «Смаленскі абласны слоўнік».

**15** — Прачыстая ў каталікоў.

**15** — 175 гадоў з дня нараджэньня паэта й журналіста Вінцэся Каратынскага (1831—1891), сакратара Ўладзіслава Сыракомлі.

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня знакамітага дэрматавэнэроляга й біяхіміка Мікалая Ягоўдзіка.

**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.

**19** — 175 гадоў з дня нараджэньня Зыгмунта Чаховіча (1831—1907), удзельніка паўстаньня 1863 г. Быў асуджаны на 12 гадоў катаргі. Па вяртаньні жыў у маёнтку Бясяды (цяпер Лагойскі раён), дзе зь ім пазнаёміўся і карыстаўся ягонай вялікай бібліятэкай малады Янка Купала.

**20** — 50 гадоў з дня нараджэньня заслужанага трэнэра Валер’я Бабука (гіравы спорт, армрэстлінг, паўэрліфтынг).

**21** — 75 гадоў з дня нараджэньня літаратуразнаўцы Юліі Канэ (1931). Дасьледавала практычна ўсю паваенную літаратуру. У 1991 г. выехала ў Ізраіль, пасьля чаго кантакты зь ёй перапыніліся.

**21** — 100 гадоў з дня нараджэньня пісьменьніка Макара Пасьлядовіча (1906—1984).

**21** — 225 гадоў (1781) з дня атрыманьня гербу Дрысай (цяпер Верхнядзьвінск).

**27** — 100 гадоў з дня нараджэньня паэта, музыкі Сяргея Новіка-Пеюна (1906—1994), аўтара славутых «Зорачак». За сваё жыцьцё паэт пасьпеў пабыць вязьнем у польскіх, савецкіх і нацысцкіх канцлягерах.

**28** — Спленьне (Прачыстая) у праваслаўных.

**29** — 250 гадоў з дня нараджэньня філёзафа, матэматыка й астранома Яна Сьнядэцкага (1756—1830), рэктара Віленскага ўнівэрсытэту, дырэктара Віленскай астранамічнай абсэрваторыі (1806—1825).

**АШ**

# Спагеці па-кіеўску

Украіна жыве без ураду, і на якасьці жыцьця ды кіраванасьці гэта не адбіваецца. Настаў апафэоз рэвалюцыі: грамадзянская супольнасьць зь яе самаарганізацыяй стала важнейшая за неэфэктыўную дзяржаву. Піша расейскі палітоляг **Фёдар Лук'янаў.**

У Кіеве сканчаецца шматмесячная эпапэя з фармаваньнем органаў улады. У расейскага назіральніка, які звыкся з маналітнай вэртыкальлю ўлады і парлямэнтам, які зь любой нагоды бярэ пад казырок, палітычныя кульбіты, што выробляюць суседзі, выклікаюць процьму пачуцьцяў — ад неўразуменьня да зларадНасьці. На тле ўкраінскага хаосу наш парадак глядзіцца асабліва выйгрышна.

Хаця з блізкай адлегласьці чахарда ў Вярхоўнай Радзе ўспрымаецца спакайней. Больш за паўгоду Ўкраіна жыве без Канстытуцыйнага суду і паўнавартаснага ўраду, з сакавіка нармальна не працаваў парлямэнт. На жыцьці краіны і кіраванасьці гэта не адбіваецца. Сытуацыя ня горшая за тую, што была год таму, калі ля стырна знаходзіўся легітымны кабінэт Юліі Цімашэнкі.

У пэўным сэнсе настаў апафэоз рэвалюцыі: грамадзянская супольнасьць зь яе самаарганізацыяй перамагла неэфэктыўную дзяржаву.

Інтуіцыя падказвае, што мы ўбачым яшчэ багата кааліцыяў. Альянсы будуць мяняцца імкліва — зь лямантам, скандаламі і брыдкімі сцэнамі ў залі пасяджэньняў. У Расеі штосьці падобнае было ў 1990-я і вядома чым скончылася — насельніцтва ўздыхнула з палёгкай, калі адчула вэртыкальную хватку. Што чакае ўкраінскую дэмакратыю і ці захаваецца яна наагул?

«Краіна, патэнцыйна вельмі прасунутая, але пры гэтым крайне нераўнамерна і недастаткова разьвітая. Падзеленая на дзьве часткі з заўважна адрозным мэнталітэтам і несупадаючымі ўяўленьнямі аб вэктары разьвіцьця. З патрыярхальным грамадзтвам, прасякнутым нефармальнымі сувязямі, з высокай ступеньню крыміналізацыі і сыстэмнай карупцыяй, пры якой бізнэс пераплецены зь дзяржапаратам. Нарэшце, абцяжараная геапалітыкай: уплыў буйных вонкавых гульцоў накладае адбітак на ўнутраную сытуацыю».

Калі вы пазналі ў гэтым апісаньні Украіну, то не памыліліся. Але насамрэч маецца на ўвазе іншая дзяржава — Італія. Праўда, ня сёньняшняя (хоць многае сапраўднае і цяпер), а тая, якой яна была пры Першай рэспубліцы — з канца 1940-х да 1992 году.



WWW.FOR-UA.COM

**Блёк Юліі Цімашэнкі пакінуў парлямэнт, патрабуючы перавыбараў.**

Італія здаўна падзеленая на высокаразьвітую індустрыяльную поўнач і адсталы аграрны поўдзень, які да таго ж — вотчына арганізаванай злачыннасьці. З 1948 году палітычная сыстэма знаходзілася «пад наглядам» ЗША. Мэта — не дапусьціць да ўлады італьянскіх камуністаў. Да сярэдзіны 1960-х дамінавалі хрысьціянскія дэмакраты, што фармавалі ўрады з дробнымі партыямі-хаўрусьніцамі, потым дадаліся сацыялісты.

За паваенныя паўстагодзьдзі на Апэнінах зьмянілася больш як 50 кабінэтаў.

Аніводзін зь іх не дацягнуў да канца мандату, сярэдняя працягласьць знаходжаньня пры ўладзе складала 11 месяцаў, мінімальная — тры дні. Шматлікія «фракцыі» прадстаўлялі розныя групавыя, карпаратыўныя і рэгіянальныя інтарэсы, прычым у кожнай меўся поўны набор партыйных аксэсуараў — ад уласнай праграмы і спонсараў да газэт. Урады, фармальна на чале з адной і той жа ХДП, на практыцы штораз уяўлялі сабой новую канфігурацыю інтарэсаў.

Але незалежна ад гэтага асноўныя рычагі заставаліся, як правіла, у руках вузкага кола кіраўнікоў, якія часьцяком займалі непублічныя пасады, напрыклад, сакратара партыі.

Пра легендарную італьянскую карупцыю, напэўна, можна не нагадваць — партыйна-дзяржаўная машына была зьнізу даверху літаральна аблытаная сувязямі зь бізнэсам і крыміналам. Бясконцыя скандалы з адстаўкамі і арыштамі вядомых дзеячаў прывялі ўрэшце да таго, што к 1990 г. ад традыцыйных партыяў проста нічога не засталося. Два сымбалі італьянскай палітыкі былі асуджаныя за сувязі з мафіяй і маштабную карупцыю — лідэр ХДП Джуліё Андрэёці (амніставаны па ўзросьце) і кіраўнік сацыялістаў Бэціна Краксі (памёр у выгнаньні).

Як магла такая краіна на чале з такой элітай пасьпяхова разьвівацца эканамічна, уваходзіць у NATO, быць заснавальніцай і асноўным чальцом Эўрапейскай супольнасьці і нават увайсьці ў элітарную «вялікую семку»? Пазьбягаючы дэталяў, можна вылучыць дзьве асноўныя прычыны.

Па-першае, прыналежнасьць да

асноўных эўраатлянтычных арганізацыяў служыла якарам, які перашкаджаў маргіналізацыі Італіі і прымушаў эліту ўсё-такі трымацца нейкіх нормаў.

Па-другое — і гэта асабліва цікава — ва ўмовах хворай дзяржавы на першы плян выступала здольнасьць грамадзтва да самаарганізацыі.

Грамадзянская супольнасьць у Італіі ня раз станавілася аб’ектам дасьледаваньняў. У 1993 г. выйшла кніга амэрыканскага сацыёляга Робэрта Патнэма пад назвай «Дэмакратыя, якая працуе». На італьянскім прыкладзе аўтар дасканальна вывучыў сетку гарызантальных узаемасувязяў і вывеў простую залежнасьць паміж колькасьцю грамадзянскіх арганізацыяў (ад харавых суполак да футбольных клюбаў) і якасьцю разьвіцьця рэгіёнаў. Так, на поўначы Італіі ўзровень грамадзянскай актыўнасьці на парадак вышэйшы, чым на поўдні.

Гарызантальныя сувязі моцныя і на поўдні, хоць там яны маюць іншы характар. Прафэсар Флярэнтыйскага ўнівэрсытэту Пол Гінзбург, дасьледнік грамадзянскай супольнасьці, адзначае выключную ролю сям’і, якая служыць у Італіі пасярэднікам паміж індывідуюмам і дзяржавай, рэгулюючы гэтыя стасункі. Можна дадаць, што мафія таксама, па сутнасьці, ёсьць своеасаблівай формай грамадзянскай самаарганізацыі.

Нарэшце, на працягу ўсяго пэрыяду Першай рэспублікі грамадзянская супольнасьць была формай існаваньня кампартыі, штучна выключанай з урадавых кааліцыяў. Італьянскім камуністам вельмі прыдалася тэорыя іх заснавальніка Антоніё Грамшы, які распрацоўваў ідэю «актыўнай грамадзянскай супольнасьці» як спосабу супрацьстаяньня буржуазнай дзяржаве.

Любая аналёгія кульгае, і ўсялякая спроба супаставіць Італію другой паловы XX ст. з Украінай пачатку цяперашняга стагодзьдзя справядліва выкліча шмат нараканьняў. Падзел «поўнач — поўдзень» Італіі і «захад — усход» Украіны адрозьніваецца шмат па якіх парамэтрах. Хоць калі браць узровень грамадзянскай актыўнасьці ў адных і схільнасьць да традыцыйнага патэрналізму ў другіх, то некаторыя паралелі ўбачыць можна. Аднак у цэлым карціны італьянскай і ўкраінскай палітыкі маюць шмат падобнага.

Італія вельмі цяжка пазбаўляецца спадчыны Першай рэспублікі. 1970-я гады прайшлі пад знакам тэрарызму левырадыкалаў — рэакцыі на разлажэньне палітычнага клясу. Разгром ранейшых партыяў (апэрацыя «Чыстыя рукі», 1992—1993), на зьдзіўленьне барацьбітоў з карупцыяй, прывёў да ўлады ня новых, сумленных палітыкаў, а ідэальнае спараджэньне сыстэмы, што ўпала, — бізнэсоўца Сыльвіё Бэрлюсконі, які паспрабаваў манапалізаваць усю мажлівую ўладу. Краіна даўно ня лічыцца сярод лідэраў росту, а сацыяльна-эканамічныя праблемы множацца.

Аднак Італія была, ёсьць і застанецца адной зь вядучых дзяржаваў адзінай Эўропы, а за апошнія 25 гадоў яна зрабіла якасны скачок у постіндустрыяльную стадыю разьвіцьця.

Ня пэўны, што ў Італіі варта вучыцца: узоры бываюць і лепшыя. Але, прынамсі, італьянскі досьвед дэманструе, што паняверыцца Ўкраіне ня варта.

**gazeta.ru**

**Фёдар Лук’янаў**

**Галоўны рэдактар часопісу «Россия в глобальной политике».**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТЭРАС

# Гастраномна-местачковы антыпатрыятызм

Паезьдзіўшы па краіне, заўважыў характэрную рэч. Прадукты мясцовых прадпрыемстваў не карыстаюцца ў тым самым мястэчку ці горадзе попытам. Піша **Руслан Равяка.**

Так, берасьцейцы ніколі не купляюць «Савушкавага прадукту». Знаёмыя раслумачылі, што аддаюць перавагу розным невялікім малочным камбінатам з наваколья — Кобрыні ці Высокага. Але тая самая прадукцыя Берасьцейскага малочнага камбінату на ўра разыходзіцца ў Менску! Менская ж прадукцыя разьмятаецца ў якіх Баранавічах... Баранавіцкія малако, кефір, кілбаса ды тушонка не карыстаюцца на мясцовым рынку попытам, і таму развозяцца ў крамы Менску і Берасьця. У якім Іўі найперш прададуць менскі хлеб, а потым ужо прыйдзе чарга івейскага. І так усюды.

Трапіўшы ў Горадню, пачуў ад сяброў пра добрую берасьцейскую гарэлку. На маё пярэчаньне, што ў Баранавічах і ваколіцах у попыце гарадзенская, бо берасьцейскай шмат падробленай, усе паглядзелі на мяне зь недаверам. У іх, як высьветлілася, усё наадварот. Пасьля невялікай дыскусіі за чаркай сышліся на меркаваньні, што ў іншыя гарады развозяць больш якасны прадукт, а рэшта застаецца на мясцовым рынку. Дый санстанцыі найперш цярэбяць прадукцыю зь іншых абласьцей.

Хай хоць сава, абы з другога сяла, казалі нашы продкі. Але ў нашым выпадку прычына іншая.

Савецкая масавая вытворчасьць прывучыла да нізкай якасьці прадуктаў. І людзі на месцах бачаць, як халтураць у іх на вачах, у якіх умовах вырабляецца «прадукт для электарату», а не для выставы — на малаказаводзе, мясакамбінаце, хлебазаводзе. А вось з «Савушкавым прадуктам» усё іначай, думаюць яны, во ў тэлевізары бачылі. А ў Менску таксама, пэўна ж, усё іначай. Бо то ж Менск…

Нам далёка да Францыі, дзе «apellation d’origine controlee» — «пацьверджанае паходжаньне» — гарантуе якасьць. Там людзі любяць сваё, бо ведаюць яго высокую якасьць. Чэхі намагаюцца спажываць піва невялікіх бровараў, а не сусьветна вядомых грандаў: больш натуральнае. Калі ў нас кожны будзе ганарыцца сваім прадуктам, тады зможам сказаць: так, наша гаспадарка стала на ногі.

*Баранавічы*

# Вялікае і маленькае

На фэсьце застой, а сярод адкрыцьцяў ізноў магілёўцы.

17-га па ліку «Басовішча» чакалі ўсе. Удзельнікі суполкі «Studenty.by» — каб давесьці, што яны здольныя зладзіць найбуйнейшы беларускі фэст ня горш, чым ранейшыя арганізатары. Удзельнікі конкурсу — у спадзеве, што ім абломіцца бясплатны запіс альбому, а гледачы — каб ізноў акунуцца ў тую незабыўную атмасфэру ва ўрочышчы Барок, калі можна пачуць улюбёныя песьні зь якасным гукам ды паматляць пры гэтым Сваім Сьцягам. «Вы на Гарадок? Гэй-ля-ля будзе?» — пытаецца на беластоцкім вакзале тамтэйшы прыхільнік «энэрэмаў» і радуецца нашаму станоўчаму адказу. «Колькі можна смажыць адну і тую ж катлету?» — скепсіс зыходзіць з вуснаў лідэра «Zero-85» Сенькі пры азнаямленьні з праграмай сёлетніх «Басаў». Частка выступоўцаў сапраўды ўдзельнічала ў леташнім і пазалеташнім фэстах. Аднак былі і сюрпрызы.

### Лёгкі першы дзень

Афіцыйна «Басовішча-2006» сваім выступам адкрылі літоўскія рок-зоркі з «IR», якія дзеля цікавасьці пагадзіліся прыехаць за бясцэнак. Прыстойны эўрарок мала хто ацаніў — яшчэ засьветла, і ля сцэны таўкуцца толькі тутэйшыя. Вакаліст «IR» Герман пасьля наведаньня «Басоў» цьвёрда вырашыў вучыць беларускую мову і паабяцаў нават запісаць песьню пабеларуску — ягоны дзед колісь кіраваў беларускім хорам у Вільні.

Перад літоўцамі ў межах «Вольнай сцэны» грымелі мясцовыя гурты. Адзін зь іх выконваў тыпова кабацкія песьні і распужаў нешматлікіх гледачоў сваім кавэрам на «Ехалі на тройцы з бубянцамі».

«Басовішча» канчаткова адышло ад свайго цяжкага фармату і стала больш рознастылёвым. Але ад гэтага ня сталася модным эўрапейскім фэстывалем. У першы дзень палова выступоўцаў былі з Польшчы. На правах гаспадароў ігралі гарадоцкія «5set5» і «Rima», якія мала каго абудзілі. Ад уроцлаўскай «Siddhartha» зыходзіла яшчэ меней драйву. Хацелася б пачуць сапраўды найлепшыя польскія каманды побач зь беларускімі музыкамі.

### Скандальная песьня Крова

У першы дзень запомніўся сваёй скандальнай песьняй «Чырвоным па белым» Кроў, у якой ён надаваў аплявух шэрагу беларускіх рок-зорак. Дзікавата падпявалі першыя шэрагі: «Памідор-оф/Фак-оф!» «Хіп-хоп — гэта найперш шчы


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Басовішча»

З Гарадка вярнуўся Сяргей Будкін.

расьць. І я не хачу хаваць сваё стаўленьне да некаторых асобаў», — растлумачыў мне рэпэр, які падчас выступу зьняў сваю фірмовую маску.

У гадзіну ночы чаравала сваёй музыкай «Тройца», якая сёлета дэбютавала на «Басовішчы». Калі б давалі спэцпрыз за самы магутны голас фэсту, яго б атрымаў Іван Кірчук — «Яблынь мая» гучала на ўвесь абсяг, будзячы ў намётах прыхмялелых гасьцей і не даючы гарадоцкім заснуць у сваіх хатах.

### Бязь зьменаў

Млявае ранішняе сонейка будзіць часовых жыхароў Барка. Раней за астатніх узьдымаюцца канкурсанты. Менавіта яны распачнуць другі дзень фэсту. Сёлета на «Басовішча» трапілі дзесяць камандаў — абсалютна розных у стылістычным пляне і прыкладна роўных па ўзроўні. Вынятак — гурт «Моцарт», якому давялося граць першаму. Музыкі добра папрацавалі ў агітацыйным пляне (іх выбралі паводле вынікаў інтэрнэт-галасаваньня на «Тузіне гітоў»), але ж іх наіўны поп-рок зь беднымі аранжыроўкамі і яшчэ бяднейшымі тэкстамі мала каго крануў.

З адкрыцьцяў конкурсу — ізноў магілёўцы. Выдатная love-рок-каманда «Vodar Susviet» з клявішамі і гітарным драйвам (крышачку пад «HIM»), простымі песьнямі і пазытыўнай энэргіяй.

А слэм можна зладзіць пад іншых магілёўцаў — «Nevma». Іх вакаліст запальваў на сцэне — калі б Мулявін нарадзіўся пасьля сьмерці Брэжнева, ён бы выконваў такую музыку.

Паводле вынікаў конкурсу магілёўцы ўзялі свае прызы. «Vodar Susviet» атрымаў электрагітару ад радыё «Рацыя», а «Nevma» — прыз ад радыё «Палёнія» за «найлепшы дэбют».

Асноўны прыз (ад БАСу і студыі «Apollo Records») дасталі «вэтэраны» адбору — гурт «Parason» на чале з Андрэем Карповічам, вядомым яшчэ як мінімум з трох гуртоў — «Млын», «Біп» і «Крона».

«Парасонаўцы» былі ўпэўнены ў сваёй перамозе, але ўсё роўна радаваліся як дзеці. Другімі героямі конкурсу сталі маладзенькія «S.D.M.» — мэнтальныя браты «Мроі» — «N.R.M.», якія атрымалі права бясплатна запісаць свой альбом на студыі «Рэмбрант».

Старшыня журы Лявон Тарасэвіч са сцэны жорстка праходзіцца па канкурсантах, кажучы, што конкурс на «Басах» ператвараецца ў нейкую «Славянскую восень». Той жа Сенька з «Zero-85» за сцэнай кажа, што «Басовішча» ператвараецца ў «запаведнік беларускага року».

Размовы пра застой на «Басовішчы» не сьціхаюць ужо каторы год, але кардынальна на фэсьце нічога не мяняецца. «Басовішча» застаецца адначасова найбуйнейшым беларускім рок-фэстывалем і мястэчковай зьявай. Ці як можна назваць фэст, які праводзіцца без сур'ёзнай рэклямнай кампаніі, прэс-канфэрэнцый, з абы-як скляпанай праграмай, без харызматычных вядучых і сур'ёзных музыкаў з польскага боку?


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Love-рок-каманда «Vodar Susviet» сьпявала простыя пазытыўныя песьні. На фота — саліст Сяржук Завадзкі.**

# Пляны на Дзень Незалежнасьці

25 ліпеня ва ўправе БНФ адбылася прэс-канфэрэнцыя з нагоды забароны канцэрту і мітынгу на плошчы Бангалор 27 ліпеня, а таксама з прычыны выхаду другой часткі альбому «Песьні Свабоды».

Адна з заяўніц акцыі, прымерканай да 16-й гадавіны абвяшчэньня дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі, Валянціна Сьвяцкая паведаміла, што заява ў Менгарвыканкам была пададзена яшчэ 11 ліпеня. «20 ліпеня прыйшла адмова, у якой гаварылася, што акцыя і канцэрт немагчымыя, бо ў гэты самы час на Бангалоры праходзяць пікеты ў абарону Казуліна, — кажа спн.Сьвяцкая. — Але ж мы прасілі для правядзеньня канцэртную пляцоўку, а пікеты праходзяць ля аўтобуснага прыпынку, за паўкілямэтра ад пляцоўкі. І раней на Бангалоры праходзіла некалькі дазволеных акцый разам і ніхто нікому не замінаў».

Валянціна Сьвяцкая паведаміла, што днямі яе выклікалі ва ўпраўленьне ўнутраных справаў Менгарвыканкаму і прапаноўвалі, каб яна ўзяла на сябе адказнасьць за магчымыя падзеі на Бангалоры 27 ліпеня. Яна адмовілася гэта зрабіць, бо не зьбіраецца ніякім чынам парушаць закон.

Арганізатары акцыі гавораць, што будуць усё адно дамагацца дазволу нават праз суд, а таксама зьбіраюцца падаць заяўку на правядзеньне такога ж канцэрту 25 жніўня, у дзень, калі дэклярацыя аб сувэрэнітэце набыла статус канстытуцыйнага закону.

**Зьміцер Панкавец**




Напрыканцы канфэрэнцыі Віталь Супрановіч парадаваў прысутных добрай навіной — 27 ліпеня выйдзе

**другая частка складанкі «Песьні Свабоды»,**

выдадзенай лэйблам «VoliaMusic». У дыск увайшлі песьні гуртоў «Zet», «Нэйра Дзюбэль», «Новае Неба», «Крама», аб'яднаныя тэмай любові да Радзімы, свабоды, незалежнасьці. «Песьні Свабоды-2», як і першую частку, можа спампаваць кожны жадаючы на сайце www.za-svabodu.org.

# Дзеці Малога Сітна



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Аднойчы ў алёшчынскую сталоўку, дзе абедалі рабочыя, басанож зайшло мурзатае, ускудлачанае дзіцё гадоў пяці ў бясформеннай вопратцы. Падаючы сталоўшчыцы заціснутыя ў кулачку сто беларускіх рублёў (ледзь дацягнулася да акенца), тоненькім галаском, які выдаў у ёй дзяўчынку, папрасіла:

— Мама сказала, што вы мяне пакорміце...

Сталоўшчыца спачатку разгубілася: «Што ж я табе, дзетачка, на сто рублёў дам...» Рабочыя загулі: «Ты ўжо нам не далівай, але ёй пакладзі поўную міску!»

Сьлёзы навярнуліся на вочы пазьней — калі дзяўчо, ледзь уладкаваўшыся за вольным столікам, пачало нават ня сёрбаць — прагна хлябтаць той гарачэнны суп, на які дзьмухалі й здаровыя мужыкі.

Недагледжаныя, галодныя дзеці зь сем'яў алькаголікаў — не навіна ані ў Сітне, ані ў Віцебску, ані ў сталічным Менску. Але тут мяне ўразіла напавал тое, *адкуль* гэтых дзяцей так шмат. Бацькі, імкнучыся атрымаць «сацыялку», наўмысна плодзяць па трое—чацвёра дзіцянят, маюць тыя ж праславутыя 250 даляраў дый прапіваюць. Натуральна, дзеці з тых грошай ня бачаць ані цацкі, ані цукерчыны. А тым часам бацькі з забясьпечаных сем'яў скардзяцца, што ад гэтых «алькашовых выпладкаў» у школе вечна бруд і вошы.

Усіх хітраспляценьняў сіценскае сямейнасьці ня здолее апісаць ніякая генэалёгія. Калі мне, удакладняючы сьпісы выбаршчыкаў, давялося высьвятляць ва ўчастковае камісіі прычыну адсутнасьці ў тых сьпісах некалькіх рабочых леспрамгасу й іхніх сваякоў, працэдуру штохвіліны суправаджалі выбухі рогату. «Такі й такі — муж гэткай? Га-га-га! Ды ў яе такіх мужоў па ўсім Сітне... А той — сын гэтага? Гы-гы-гы, ведаем мы, хто ягоны бацька!.. Гэты — сужыцель, тая — сужыцелька, у яе сваё прозьвішча, той увогуле байструк...» Афіцыйна зарэгістраваных мужоў і жонак на кожнай вуліцы Сітна можна пералічыць па пальцах. Вядома, ідзецца пра тых, хто «расьпісаўся» у мясцовым клюбе, які выконвае функцыю ЗАГСу; пра належнае вянчаньне й царкоўны шлюб няма й гаворкі.

Паўвёскі плаціць алімэнты або «ўтрымлівае» кагосьці...

Глыбіню тутэйшае распусты можна ўявіць, жывучы ў адным інтэрнаце з «хімікамі» й рабочымі зь іншых вёсак. Некалькі кабетаў няпэўнага ўзросту штовечары «пасьвяцца» ля рабочых, а адны й тыя ж дзяўчаты 14—20 гадоў «абслугоўваюць» за шклянку «максімкі» й міску супу суседзяў-

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 17—24 ЛІПЕНЯ

**17 ліпеня**

Як паведамляе прэс-служба АГП, актывісту АГП **Ігару Шынкарыку**, што фатаграфаў аўтамабіль, якім Анатоля Лябедзьку везьлі на суд, старшына спэцназу пагражаў пісталетам, патрабуючы зьнішчыць здымкі.

У Кобрыні актывіста Партыі БНФ **Алеся Меха** аштрафавалі на 1 базавую велічыню (31 тыс. руб.) за распаўсюд улётак.

**18 ліпеня**

Пракуратура Менску аднавіла расьсьледаваньне справы пра зьбіцьцё 2 сакавіка журналіста «Комсомольской правды в Беларуси» **Алега Ўлевіча**.

Судзьдзя Заводскага раёну Алег Зямцоў не задаволіў скаргі адвакатаў **Аляксандра Казуліна** на супрацоўнікаў «Алмазу», якія арыштавалі палітыка 25 сакавіка, абражалі яго і нанесьлі траўмы.

Беспрацоўнага **Ігара Крыштона** ў Воршы суд аштрафаваў на 1 б.в. за плякаты «Свабоду Казуліну».

У Менску затрымалі **Віталя Супрановіча** і **Віталя Зыблюка**: на іх былі значок «За свабоду!» і бел-чырвона-белая майка са старым лягатыпам «Басовішча».

**19 ліпеня**

Арганізатару травеньскай сустрэчы ў Ратамцы абаронцаў намётавага гарадка **Алесю Мазуру** прыйшла позва ў суд: яго вінавацяць у парушэньні прыродаахоўнага заканадаўства. Справа была накіраваная ў суд Сьветлагорскага раёну, дзе Мазур прапісаны, але позву ён атрымаў са спазьненьнем.

На пікеце з расьцяжкай «Адмена саюзу з Расеяй!» на плошчы Перамогі ў Менску затрыманыя **Дар'я Малдаванава** і непаўналетнія **Тацяна Камкар**, **Максім Салаўёў**, **Руслан Мацьвееў**, **Настасься Шашкова**. Непаўналетніх адпусьцілі, а Малдаванаву завезьлі на Акрэсьціна і за «дробнае хуліганства» наступнага дня аштрафавалі на 2 б.в.

**20 ліпеня**

У Салігорску міліцыянты затрымалі моладзевага актывіста **Глеба Сандраса**, правялі асабісты надгляд і канфіскавалі ў яго 1,5 тыс. налепак.

Моладзевага актывіста **Вадзіма Бабілу** выклікалі ў Асіповіцкую ўправу КДБ сьведкам у справе «Маладога фронту».

Моладзевай актывістцы з Рагачова **Каці Жылінскай** пагражае штраф у 50 б.в. (1,55 млн руб.): яе вінавацяць у адміністрацыйным парушэньні пры прыёме грашовых сродкаў — нясвоечасовым скасаваньні чэка.

Суд над **Юрасём Іванюковічам**, якога вінавацяць у нанясеньні надпісаў на беларускім пасольстве ў Маскве, перанесены на 17 жніўня: на працэс не зьявіўся перакладчык.

**21 ліпеня**

Гомельскую моладзевую актывістку **Юлію Сівец** афіцыйна папярэдзілі ў пракуратуры за дзейнасьць у моладзевым цэнтры «Гарт», зачыненым уладамі ў 2003 г.

«хімікаў», якія мяняюцца ці не штотыднёва. Начныя разборкі за сьценкай, калі малалетнія шлюхі нападпітку высьвятляюць, чаму гэта не ў сваю чаргу тут учора начавала Сьветка, а не якая там Алеська і хто каго «кахае», наколькі мярзотныя, настолькі й звычайныя.

Падлічыць, колькі ў Малым Сітне робіцца абортаў, як вы разумееце, практычна немагчыма. Многія з тых жанчынаў, якія садзяцца на рэйсавы аўтобус або выпраўляюцца ў Полацак па прадукты, дарогаю зойдуць у клініку. Агулам кажучы, амаль у кожным беларускім сельсавеце за апошнія 12 гадоў ціхай сапай адбыўся свой *Беслан* з сотнямі дзетак-ахвяраў.

Ёсьць у Сітне й дзіцячы садок, малых каля трыццаці. Ды толькі бацькі пастаянна наракаюць то на кепскае харчаваньне, то на сэрыялы, якія нянькі днямі глядзяць разам зь дзецьмі (а потым якое-небудзь чатырохгадовае дзіцё лезе да мамы цалавацца ўзасос і тлумачыць, што так Хуаніта з Рамірэсам па тэлевізары робяць).

Безумоўна, ёсьць тут і добрапрыстойныя, забясьпечаныя сем'і — але звычайна з адным, максымум дваімі дзецьмі. І гэтыя дзеці, ледзь толькі асвоіўшы машынкі ды лялькі, ужо рыхтуюцца вырасьці, вывучыцца й зьехаць адсюль куды далей.

Якім чынам уратаваць дзяцей Малога Сітна ў Новай Беларусі?

«Дзіцячыя» сацыяльныя выплаты, гарантаваныя нацыянальным бюджэтам, мусіць кантраляваць мясцовая ўлада, а не райвыканкам. Толькі тады, пад штодзённым наглядам, пагроза страты бацькоўскіх правоў прымусіць тых гора-бацькоў траціць грошы на дзяцей.

Моцная сям'я зь вянчаньнем у царкве і афіцыйнай рэгістрацыяй павінна стаць найпершым стандартам сацыяльнай рэклямы. У сужыцельстве? Разьведзеная? Нежанаты? Плаці падатак!

Ліцэнзіі тэлеканалаў, асабліва кабэльных, што бамбардуюць падлеткавую аўдыторыю прапагандай распусты, трэба перадаць сямейным, панавальным, адукацыйным і хрысьціянскім мэдыям.

«Ператварыць сваё мястэчка, сваю вёску ўласнымі рукамі ў квітнеючы цуд!» — скразная ідэя новае дзяржаўнае сярэдняе адукацыі. Плюс — нядзельныя школкі пры цэрквах, касьцёлах і дамох малітвы. Нацыянальны ўнівэрсытэт, ліцэі й гімназіі па-беларуску.

Аборты... Паводле статыстыкі, сёньня іх у Беларусі больш, чым нараджэньняў. Забойства ненароджаных дзяцей мусіць быць забаронена. Нядаўна чытаў, што ў польскіх кляштарах пачалі адчыняць «вокны жыцьця», куды можна таемна перадаць немаўля. Гадаваньнем і выхаваньнем кінутых дзяцей мусіць займацца не дзяржава, а царква з дапамогай бюджэтных субсыдыяў.

...Толькі тады, калі беларускія дзеці пачнуць марыць, як вырастуць, стаць не бандытамі або мільянэрамі, а дактарамі ды сьвятарамі, — зробіцца ясна, што краіна ахопленая нацыянальным абуджэньнем.

*в.Малое Сітна*

Падаючы сталоўшчыцы заціснутыя ў кулачку сто рублёў, тоненькім галаском папрасіла: — Мама сказала, што вы мяне пакорміце...

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 17—24 ЛІПЕНЯ

Менскі гарадзкі гаспадарчы суд пазбавіў царкву «Новае жыцьцё» будынку, дзе ладзяцца богаслужэньні. За памяшканьне ў 1600 кв.м царкве заплацяць 37,5 млн руб. кампэнсацыі.

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю палічыў правільнай забарону на чарнобыльскі мітынг, які меркавалася правесьці ў красавіку. Адмову абскарджваў актывіст ПКБ **Васіль Палякоў**.

Менгарвыканкам адмовіў у дазволе на правядзеньне канцэрту на плошчы Бангалор 27 ліпеня. Акцыя прымяркоўвалася да гадавіны прыняцьця Дэклярацыі аб незалежнасьці.

### 22 ліпеня

У Салігорску падчас акцыі падтрымкі А.Казуліна жорстка зьбітыя пры затрыманьні непаўналетнія моладзевыя актывісты **Іван** і **Ільля Шылы**. Ільлю Шыла, які фатаграфаваў акцыю, прывезьлі ў пастарунак у кайданках. Былі затрыманыя таксама двое людзей на плошчы, якія проста назіралі за акцыяй.

22 ліпеня зьнік актывіст АГП і абаронца намётавага гарадка **Дзяніс Дзянісаў**. Ён знайшоўся толькі праз 2 дні: паведаміў, што яго зьбілі невядомыя, выкралі й вывезьлі ў Расію. Там ён, зь ягоных словаў, змог ад іх зьбегчы. **Тацяна Елавая**, якую таксама спрабавалі скрасьці, уцякла ад невядомых яшчэ ў Менску.

Каля расейскага пасольства ў Менску затрыманы грамадзяне Расеі **Мікалай Збарашэнка** і **Кацярына Вінакурава** з моладзевага руху «Абарона», а таксама грамадзянін Беларусі **Віктар Сімановіч**. Яны пратэставалі супраць саміту СНД у Маскве і таго, што Расея падтрымлівае беларускі рэжым. Расейцаў адпусьцілі, склаўшы пратаколы за адміністрацыйнае парушэньне і прызначыўшы суд на 26 ліпеня.

### 24 ліпеня

Менгарсуд задаволіў скаргу незалежнага прафсаюзу РЭП і абавязаў суд Савецкага раёну Менску разгледзець справу пра адмову ў рэгістрацыі прафсаюзнай суполкі на МАЗе.

Стала вядома пра датэрміновае вызваленьне **Сяргея Ляшкевіча** — 27 ліпеня. Асуджаны на 5 месяцаў арышту актывіст павінен быў выйсьці на волю 11—12 жніўня.

У Магілёве ўлады не дазволілі акцыі пратэсту незалежнага прафсаюзу РЭП супраць нерэгістрацыі прафсаюзных суполак, прызначанай на 25 ліпеня, бо не было домовы на ўборку тэрыторыі. Новую заяўку падалі на 9 жніўня.

Дэпутатку Круглянскага райсавету **Зінаіду Мілешчанку** не пусцілі на прыём да кіраўніка палаты прадстаўнікоў Уладзімера Канаплёва, які прыехаў у сваю выбарчую акругу ў Круглае. Дэпутатцы заявілі, што Канаплёў не жадае зь ёй сустракацца, бо яна ўздымае непрыемныя пытаньні, сьцьвярджае сама сп-ня Мілешчанка.

**АШ**



ГАВАРЭНЬ ПАЛІНА

# Нявінны беларускі цмок

У Гомелі нарадзілася чарговая «Легенда зь пяску», а ў Заслаўі рыхтуюцца вылепіць 12 залатых апосталаў.

У дахрысьціянскія часы, кажа скульптар Гэнік Лойка, цмок на беларускіх землях уважаўся за нявінную істоту, дарма што забіраў у ахвяру найпрыгажэйшых жанчынаў. З гэтым тады не спрачаліся — так было трэба. Пасьля прыйшоў сьвяты Юр'я і забіў небараку. З таго часу — як беларусы атрымалі хрысьціянства, а разам зь ім акрэсьлены падзел на дабро і зло — цмок ператварыўся ў выразна адмоўнага пэрсанажа. У горадзе над Сажом удзельнікі пленэру даводзілі адваротнае.

Прыехаўшы на месца, менчукі ўбачылі першага цмока — МАЗ, што прывёз пясок, захрас у ім і, задраўшы кузаў у неба, пагрозьліва роў рухавіком. Арганізатарам выступіў гомельскі гісторык Яўген Малікаў. Ён дамовіўся зь мясцовай уладай наконт мерапрыемства, арганізаваў валянтэраў і зладзіў невялічкую культурную праграму, падчас якой сярод іншых выступіў і аўтар «НН» Сяргей Балаханаў.

Мясцовыя скульптары на чале зь Яняй Канавалавай ад пачатку прапанавалі сп.Лойку правесьці конкурс. У іх было сваё бачаньне наконт таго, што ў рамках пленэру магло б паўстаць зь пяску, — «прыгожы гатычны замак з ільвамі і грыфонамі». Аднак менчукі цьвёрда настойвалі на супольнай працы і ў выніку працавалі разам з валянтэрамі Малікава.

На другі дзень высьветлілася, што цмок выходзіць вышэйшы за азначаны раней памер — не ў адзін чалавечы рост, а ў два. На прэзэнтацыі кіраўнік праекту будзе «зайздросьціць» гамельчукам: «Прыехалі сюды рабіць цмока, а ён у вас ужо ёсьць — сам расьце зь пяску».

Гамельчукі пад'ялдыквалі: «Вы б яго цэмэнтам замацавалі, ці што, а то шкада… » На што Гэнік Лойка традыцыйна адказдаў: «Не пясок шкадуйце — шануйце культуру, мову, што рассыпаецца ў пясок, калі пра яе ня дбаць».

Згодна зь легендай, кожны паважаючы сябе цмок мусіць мець іскрысты позірк, агністае дыханьне і сівы дым з вушэй. Стваральнікі гомельскага цмока абмежаваліся дымам з вушэй, а замест іскраў зрабілі свайму цмоку люстэркавыя вочы, у якіх кожны, хто не баяўся скамянець, мог убачыць сваё адлюстраваньне.

Гомельскі пленэр прайшоў, а Гэнік Лойка ўжо запрашае на новы: 24—25 жніўня ў Заслаўі паўстануць 12 залатых апосталаў. Галоўная ідэя гэтага пленэру, тлумачыць ён, давесьці, што нацыя памятае пра свае сьвятыні: «Пясок рассыплецца, і апосталы зноў зьнікнуць, але мы пакажам, што памятаем пра іх і ня толькі пра іх».

Мяркуецца, што ўдзел у працы возьмуць 12 маладых скульптараў. Патрэбная дапамога добраахвотнікаў. Г.Лойка будзе асабліва рады бачыць сярод іх герояў сакавіка. Кантактны тэл. (017) 299-05-81. І сачыце за рэклямай.

**Сямён Печанко**

# Беларускі студэнцкі летнік



ІГАР МАРАЧКІН

Прывітаньне, Студэнт!

Самая студэнцкая тусоўка вітае цябе!

1—5 жніўня мае адбыцца Беларускі студэнцкі летнік.

Беларускі студэнцкі летнік — гэта:

— уЛётны адпачынак у адным з маляўнічых куткоў Беларусі;

— новыя заЛётныя знаёмствы;

— адкрыцьцё новых уЛётных даляглядаў і магчымасьцяў.

У летніку возьмуць удзел пад 40 студэнтаў і навучэнцаў з усіх рэгіёнаў краіны.

У праграме летніка ёсьць цікавае навучаньне, гульні.

У канцы летніка плянуецца правядзеньне музычнай імпрэзы «Піўны корак».

Паўдзельнічаць у летніку можа кожны беларускі студэнт ці навучэнец.

Арганізатары летніка забясьпечваюць удзельнікаў харчаваньнем, пражываньнем і ўлёткамі :).

Пражываньне — у намётах.

Для ўдзелу ў самай улётнай імпрэзе трэба папрасіць анкету праз адрас: letnik2006@gmail.com — і даслаць яе на той самы адрас.

Дашліце гэтую інфармацыю сваім знаёмцам, і будзе вам з гэтага шчасьце.

## КАІСА

# Сьпякотны «Оўпэн»

Другі год запар у Менску ладзіцца буйны міжнародны турнір «Інаўтамаркет-оўпэн». Гэта ледзь не адзінае ў краіне шахматнае спаборніцтва, дзе аматар можа — у тэорыі — на роўных пабіцца з прафэсіяналам. На практыцы ўступныя ўнёскі адпужалі шмат каго з патэнцыйнага ўлову арганізатараў. За права згуляць дзевяць партый удзельнікі мусілі выкласьці да 90 «умоўных». Што справакавала ціхія нараканьні ў кулюарах Палацу шахмат — які ж гэта, маўляў, адкрыты турнір?

«Крок назад у параўнаньні зь мінулым годам», — адкамэнтаваў падзею заўсёднік Палацу Лявон Шацько. Зь ім нязгодны галоўны судзьдзя Зьміцер Лыбін: «Ад падвышэньня ўнёскаў турнір толькі выйграў». Сапраўды, фірма «Інаўтамаркет» парупілася аб прыемнасьцях для гульцоў і гасьцей імпрэзы. Ад сьпёкі шахматыстаў ратавалі кандыцыянэры. У час урачыстага беларускамоўнага закрыцьця свае ўмельства паказалі артысты музкамэдыі, «Качаткоў-тэатру» і нязьменны вядоўца Ўладзімер Навіцкі. Дый прызы сягалі сямізначных сум.

Пасьля ўдалага старту выбыў з гонкі найстарэйшы беларускі гросмайстар Віктар Купрэйчык. Прычына — пагаршэньне здароўя.

Добра ўсё ж, калі аматарам ёсьць дзе павыпрабоўваць старыя добрыя шахматы з клясычным кантролем часу. Пераможцамі ж выявіліся «гросы» — украінец Яўген Мірашнічэнка, расеец Ігар Курносаў і беларус Аляксей Фёдараў. Кожны ўзяў па 7 балаў зь дзевяці. Судзьдзі адзначылі і выдатную гульню выхаванца менскай СДЮШАР-11 Сяргея Міхайлоўскага (4-е месца). 26-гадовы мянчук, які напярэдадні шмат папаезьдзіў па расейскіх шахматных Мэкках, выканаў норму гросмайстра, хоць праз нісянеціцу ў ФІДЭ ня мае пакуль нават званьня міжнароднага майстра.

**ВР**

**Як бы вы згулялі?**

П. Ламака (Беларусь, 2435) — М. Пагасян (Беларусь, 2152)



**Адказ:** не, у дыяграме няма памылкі. Вартасьць за белых меў любы ход, нават 1. a4, абы Павал Ламака завіўся на гульню ў апошнім туры. Праз ягонную няяўку кандыдат у майстры Манвэл Пагасян страціў сумленна заваяваны майстарскі бал. Зараз Паўлу сьвеціць дыскваліфікацыя.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 29 ліпеня

**«Лад», 13.00**

«Зора»

Францыя — Італія, 1974, рэж. Дуча Тэсары.

Прыгодніцкі фільм.

Мсьцівец у масцы дае прыкурыць усім нягоднікам і багатырам...

Старая добрая клясычная стужка з Аленам Дэлёнам у ролі Зора.

**БТ, 13.40**

«Мадэмуазэль мушкетэр»

ЗША — Харватыя — Італія, 20043, рэж. Стыў Бойум.

Прыгодніцкі гістарычны фільм.

Паводле сцэнарыстаў карціны, у д'Артаньяна была дачка. Калі ў караля скралі нявесту, гераіня разам з сынамі Атоса, Партоса й Араміса адпраўляецца вызваляць Францыю...

Ролі ў гэтай тэлевізійнай стужцы граюць знакавыя акторы Настасься Кінскі, Жэрар Дэпард'ё, Майкл Ёрк.

**«Лад», 16.40**

«Пары і дуэты–3. Альфрэд Хічкок і Тыпі Хэдрэн»

Францыя, 2003.

Дакумэнтальны сэрыял.

Гэты выпуск прысьвечаны генію саспэнсу Альфрэду Хічкоку — і актрысе Тыпі Хэдрэн.

**Андрэй Расінскі**

## Ў ІВЕНЦЫ

**Музычная майстэрня**

Чацьвёрты год запар у Івянцы (Валожынскі р–н), з ініцыятывы пробашча касьцёлу Сьв.Міхала ладзіцца «Музычная майстэрня». Удзельнічаюць каталіцкая моладзь і сьвятары з Беларусі і Польшчы. На працягу тыдня ладзяцца канцэрты.

У пятніцу, 28 ліпеня, у Івянецкім Доме культуры адбудзецца заключны канцэрт, пачатак а 20–й.

**Вінцэнт Солтан**

## ТЭАТРЫ

**Прэм'ера ў Купалаўскім**
28 **(пт) — «Маэстра»**
Свой 86–ы тэатральны сэзон Нацыянальны акадэмічны тэатар імя Янкі Купалы завяршае прэм'ерай — спэктаклем «Маэстра» паводле п'есы сучаснага ўкраінскага драматурга Марыі Ладо. Спэктакль прысьвячаецца 250–годзьдзю Вольфганга Амадэя Моцарта.

## ВЫСТАВЫ

**Перад вобразам тваім**
З 28 ліпеня да 10 жніўня ў Палацы мастацтва (Казлова, 3) працуе пэрсанальная выстава мастацкай вышыўкі Алы Гопшы. Творы выкананы ў розных тэхніках ніткамі мулінэ, воўнай, шоўкам, штучнымі ніцямі. Гэта — партрэты, абрусы і сурвэткі, вопратка і абутак...

## СПОРТ

**Футбол. Кубак УЭФА**
«Дынама» (Менск) – «Заглэмбе» (Любін, Польшча).
Менск. Стадыён «Дынама». Пачатак у 18.30.
Першы матч — 1:1

**Чэмпіянат Беларусі**
30 ліпеня (нядзеля):
«Лякаматыў» (Віцебск) — МТЗ-РІПА (Менск)
«Белшына» (Бабруйск) — «Нафтан» (Наваполацак)
31 ліпеня (панядзелак)
«Шахцёр» (Салігорск) — «Дынама» (Менск). Матч пройдзе ў Любані.
БАТЭ (Барысаў) — «Дарыда» (Ждановічы)
«Дынама» (Берасьце) — «Нёман» (Гародня)
«Гомель» — «Дняпро» (Магілёў)
«Лякаматыў» (Менск) — «Тарпэда» (Жодзіна). Матч пройдзе ў Маладэчне.

# Кубак Свабоды


PHOTO.BYMEDIA.NET

У суботу 29 ліпеня а 9–й на стадыёне «Вымпэл» у парку Чалюскінцаў пачнецца X футбольны турнір «Кубак Свабоды» памяці Генадзя Карпенкі. У ім возьмуць удзел каманды ПКБ, БНФ, АГП, БСДП (Г), зборная «нячэсных журналістаў». Прадэманстраваць сваю спартовую форму мусіць і Анатоль Лябедзька, які 26 ліпеня павінен быў выйсьці з Акрэсьціна, а палітыкі пакажуць сапраўдную еднасьць дэмакратычных сілаў на футбольным полі.- Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Здыхлік васьміножны

**«Піраты Карыбскага мора: куфар мерцьвяка»** («Pirates of the Caribbean: Dead Man's Chest»).

ЗША, 2006, каляровы, 150 хв.

**Жанр:** прыгоды.

**Адзнака:** 5,5 (з 10).

Другая сэрыя фантазійных піратаў урачыстая й эпічная, як каралева ў пошуках трэцяга мужа.

Шчасьлівых маладых (Арланда Блума й Кіру Найтлі) арыштоўваюць на вясельлі за дапамогу пірату (Джоні Дэп уласнай пэрсонай). У дзяўчыны ёсьць толькі адзін шанец — адшукаць старога прайдзісьвета Джэка Вераб'я — і здабыць у яго компас, які паказвае на пажаданыя сэрцу скарбы. Але ў няўрымсьлівага Вераб'я — свае праблемы. Яму пазарэз трэба куфар мерцьвяка...

Фішка сэзону — лаўкраўтаўскія пачвары на караблі–прывідзе: матрос–рыба–молат, аблеплены ракавінкамі бацька Арланда Блума — і, безумоўна, капітан Лятучага Галяндца — мёртвы васьміног Дэйві Джонз. У Джонза шчупальцы замест барады і цяга да арганнае музыкі. Але самая вялікая ягоная тайна — амаль што тутэйшая.

Сваю сьмерць марскі сваяк Здыхліка


WWW.MOVIEWEB.COM

Несьмяротнага хавае ў куфры. У гэтым куфры няма ані зайца, ані качкі, ані яйка з іголкаю — ёсьць толькі сэрца, спакутаванае ад каханьня. Але важны сам прынцып.

Атракцыёны паўтараюцца: зноў і зноў шчупальцы, шчупальцы, шчупальцы, зноў і зноў коціцца кола, на якім б'юцца мушкетэрамі героі карціны, зноў і зноў надрыўны Джоні Дэп натыкаецца на канібалаў. А лепей за Арланда Блума іграюць нават цурбаны.

Хаця прычэпістае вока здольнае знайсьці ў карціне нуду — апошнія сцэны стануць ударам пад дых. Амаль трохгадзінны фільм ёсьць толькі пралёгам да трэцяе часткі…

Квіткі на фільм варта купляць загадзя: залі перапоўненыя.

**Андрэй Расінскі**


## Саколкі гатовыя: чорныя і белыя

**Чытачы «НН» вырабілі майкі (цішоткі) да стагодзьдзя газэты. Замовы прымаюцца на e–mail: zamova2006@tut.by і тэл. (029) 649–08–88. Пазначаць трэба імя, кантакт (мэйл ці тэлефон), колькасьць і памер. Каштуе такая саколка 15 тыс. рублёў.**



**...судзьдзя Рыбакоў, які судзіў Казуліна, быў футбольным рэфэры.**




— Чырвоная картка! За што?!

— За спробу недазволенай перадачы.



**...Лукашэнка прарваўся у космас.**

— Я ж казаў табе — трэба было тую «Белку» раскалашмаціць. Цяпер бы не адбіралі паўзаробку на галяктычныя Дажынкі.



**...Чавэс, захоплены «Лініяй Сталіна», захацеў пабудаваць у Вэнэсуэле нешта падобнае.**

— Сардэчна запрашаем на «Лінію Балівара», шаноўныя турысты. Зараз вы ўбачыце гістарычную рэканструкцыю перамогі ацтэкаў над флётам Калюмба.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ


### Я Чавэса бачыў

Лукашэнка падарыў Чавэсу шаблю, а той сказаў, што абедзьве краіны мусяць трымаць руку на клінку. **Старонка 14.**

### Спагеці па-кіеўску

Украіна жыве без ураду, і на якасьці жыцьця і кіраванасьці гэта не адбіваецца. Настаў апафэоз рэвалюцыі: грамадзянская супольнасьць зь яе самаарганізацыяй стала важнейшая за неэфэктыўную дзяржаву. Піша расейскі палітоляг Фёдар Лук'янаў. **Старонка 22.**

### Вялікае і маленькае «Басовішча»

На фэсьце застой, а сярод адкрыцьцяў ізноў магілёўцы. З Гарадка вярнуўся Сяргей Будкін. **Старонка 24.**

### Краты італьянскія і беларускія

У Беларусі можа разгарэцца футбольны скандал, падобны да італьянскага. **Старонка 15.**


# Радзіма яго дарагая



Шклоўшчына сёньня — адзін вялізны аграгарадок. Аляксандар Лукашэнка не шкадуе грошай для разбудовы сваёй малой бацькаўшчыны. Рэпартаж з Шклоўшчыны Барыса Тумара і Сяргея Мікулевіча. Старонка 6.

**На фота: Такой вяхоткай шараваўся у лазьні Аляксандар Лукашэнка. Старонка 8.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Зьмітру.** Паспрабуйце сябе ў прозе ці грамадзкай працы. Вершы — ня Ваша дарога.

**Хведару С.** Гэта яшчэ ня варта друку. Мова добрая, а спалучэньня навіны й чысьціні вобразу няма.

**Ігару Ш. зь Менску.** Палітыкі таму і «зломкі», што за імі не стаіць беларускі капітал. Прыгадваецца герой Гарэцкага, які захацеў зарабіць столькі, каб скупіць для беларусаў усюткую Вільню. Станьце такім багатым, каб «скупіць для беларусаў» цэлы Менск, — і адкуль возьмуцца палітыкі-нязломкі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Гор. Ігумен, Менск. губ.** У двары Божына нет ведама хто нядаўна аблупіў кару з 84 пнёў панскага саду і папсаваў вадзяны млын, каторы заліваў сялянскія сенакосы. Пан з гэтага двара западозрыў сялян з суседніх вёсак, але справа так і не раскрылася дагэтуль.

**М. Любча, Менск. губ., Наваградз. пав.** Наша мястэчка сёлета ўжо два разы пачынала гарэць, а зь якой прычыны, нет ведама. Як прыходзіць лета, у нас людзі становяцца вельмі падазрыцельнымі і заўсёды склонны думаць, што нехта падпальвае; так было апошні раз і ў Любчы: разышлася па мястэчку вестка.

**«НН», 1911, №27**

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**

проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 2.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Наталка, віншую Цябе** і Тваю сям'ю з нараджэньнем дачкі Аляксандры і зычу (на жаль, спозьнена) шчасьця і здароўя мілым пражанкам. Сябар

### ЖЫТЛО

**Мама з 4-гадовай дачушкай** здымуць недарагую 2– ці 1,5–пакаёўку, можна ў прыватным сэктары. Т.: 8–029–269–95–36

**Шукаем** 1–пакаёвую кватэру. Парадак і своечасовую аплату гарантуем. Т.: 269–45–87 (Тацяна), 567–74–45 (Сямён)

### КАНТАКТЫ

**Сяржук Пятровіч**, адгукніся! Валянціна. Т.: 259–97–80

### ГЕНЭРАТАР

**Патрэбны генэратар** для правядзеньня фэстывалю «Аршанская бітва–2006». Т.: 319–65–74

### ДАВЕДНІК

**Падрыхтаваны энцыкляпэдычны даведнік** «Рэпрэсаваныя сьвятары». Калі Вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753–82–12, 755–25–61, (017) 211–09–53. Леанід Маракоў

### ТРАКТАР

**Куплю трактар** МТЗ. Т.: 164–93–85

### ВАНДРОЎКА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа па маршруце: Альбярцін—Сынковічы—Слонім—Нянадавічы—Дварэц—Дзятлава. Тэл.: 292–54–58, 622–57–20 («Вэлком»), 509–12–16 (МТС)


**Наша Ніва**

**незалежная газэта**

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2371. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.07.2006.

Замова № 4114.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.